Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

20 ВЕРАСНЯ 2014 г. СУБОТА № 179 (27789) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ГРОДЗЕНШЧЫНА СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жыхароў Гродзеншчыны з 70-годдзем з дня ўтварэння вобласці.

«Ваш край па праве лічыцца беларускай жытніцай, на дасягненні гродзенскіх хлебаробаў сёння раўняецца ўся краіна. Значных поспехаў вы дасягнулі ў хімічнай, лёгкай і харчовай прамысловасці, вытворчасці будматэрыялаў. Прадукцыя прадпрыемстваў вобласці вылучаецца высокай якасцю і добра вядомая на сусветным рынку», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У віншаванні гаворыцца, што дзякуючы дзіўнай прыродзе, гісторыка-культурнай спадчыне і шэдэўрам архітэктуры расце турыстычная прывабнасць рэгіёна. Жывапісныя сядзібы і замкі, беражліва захаваныя, некранутыя ландшафты служаць сапраўдным упрыгажэннем беларускай зямлі.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што нашым галоўным багаццем заўсёды былі людзі. На думку Прэзідэнта, ураджэнцы Гродзеншчыны ўслаўляюць Радзіму працоўнымі здзяйсненнямі, спартыўнымі перамогамі і творчымі дасягненнямі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НЕ МЯКІНА, А КУЖАЛЬ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка патрабуе адрадзіць былую славу беларускага льну

Учора кіраўнік дзяржавы наведаў прадпрыемствы па перапрацоўцы льну ў Аршанскім раёне і правёў нараду, прысвечаную пытанням ільняной галіны.

Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Арэхаўскі льнозавод», азнаёміўшыся з ходам рэканструкцыі і мадэрнізацыі, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт цікавіўся ўмовамі захоўвання сыравіны, тэхналагічнымі працэсамі выпрацоўкі льновалакна на сучасным абсталяванні. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, да 2015 года з 36 дзейных ільнозаводаў плануецца пакінуць 25, з іх 10–12 будуць аснашчаны самым сучасным абсталяваннем. Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку рабоце прадпрыемства. Прэзідэнт таксама наведаў Аршанскі льнокамбінат, дзе гаворка ішла аб рэканструкцыі, тэхнічным пераўзбраенні і павышэнні эфектыўнасці працы гэтага прадпрыемства.

Закранаючы пытанне працягу мадэрнізацыі на прадпрыемстве, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта занадта затратна. «Кошт пытання — ад $70 млн да $100 млн. Такія грошы яшчэ трэба знайсці, але памятайце пра тое, што разлічвацца ў асноўным прыдзецца вам, — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да работнікаў прадпрыемства. — Праўда, зараз прадукцыя зусім іншая. І калі так, як кажа кіраўнік, прадаецца ваш тавар і нават вышэй за рыначную цану ў свеце, напэўна, аўчынка вырабу вартая, паглядзім».

Аляксандр Лукашэнка не выключыў, што ў перспектыве, калі на лён будзе попыт, у краіне прыйдзецца пашыраць пасевы і льновытворчасць. «Мы ўмеем працаваць з ільном, вырабляць з яго тканіны, і страціць гэтую школу нельга, мы проста не маем на гэта права», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе па пытаннях развіцця ільняной галіны, якая прайшла на Аршанскім ільнокамбінаце, Прэзідэнт нагадаў, што ў сакавіку 2010 года ў Оршы ўжо праводзілася аналагічная нарада; звярнуў увагу на тое, што ўрад узяў на сябе абавязацельства па выкананні намечанага, дзяржслужачыя атрымалі канкрэтныя даручэнні. Затым быў прыняты комплексны бізнес-план развіцця льнаводчай галіны Беларусі на 2013–2015 гады. Але, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, «асноўная маса праблем, пра якія гаварылася на папярэдняй нарадзе, існуе да гэтага часу».

«Як бы ні хацелася прыўкрасіць сітуацыю ўраду і мясцовай уладзе, дзяржаўных кантралёраў не падманеш. Мне дакладваюць, што, як і раней, фактычна ва ўсіх абласцях мелі месца факты сяўбы лёну з парушэннем аптымальных тэрмінаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што не выконваецца тэхналагічны рэгламент вырошчвання гэтай культуры, што цягне недабор таварнай прадукцыі і пагаршэнне яе якасці.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што мадэрнізацыя льнозаводаў зацягнулася, планы не выконваюцца. Акрамя таго, мелі месца факты, калі закупленае дарагое абсталяванне прастойвала на вуліцы, даводзілася ўмешвацца кіраўніку дзяржавы. «Тэрміны комплекснай мадэрнізацыі Аршанскага льнокамбіната сарваныя. Аб'екты, пераабсталяванне якіх планавалася на першым этапе, перанеслі на другі. Але і другі этап мадэрнізацыі ўжо значна адстае ад графіка», — адзначыў Прэзідэнт.

«У выніку заканамерны вынік — галіна застаецца стратнай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Прайграе ў канкурэнтаздольнасці на кожным этапе перапрацоўкі лёну. Аб'ёмныя і якасныя паказчыкі льнопрадукцыі, якая рэалізуецца, не адпавядаюць патрабаванням часу і магчымасцям нашых прадпрыемстваў».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне ўжо нямала зроблена, каб падняць ільняную галіну на больш высокі ўзровень. «Гэтая культура для Беларусі палітычная. Яна на гербе нашай краіны. Але справа тут нават не ў палітыцы: гэта выдатны тавар, выдатны прадукт!» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што павінна больш вырабляцца і пастаўляцца на рынак такіх тканін, якія былі прадэманстраваны яму на Аршанскім ільнокамбінаце.

«Па інфармацыі Белстата, у сусветнай вытворчасці льновалакна Беларусь займае другое месца. Пара колькасці пераходзіць у якасць. Былую славу беларускага лёну мы абавязаны адрадзіць. У гэтай сферы мы павінны быць заканадаўцамі моды», — падкрэсліў Прэзідэнт.

ПЫТАННЕ ПАВЫШЭННЯ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ ПАКУЛЬ НЕ АБМЯРКОЎВАЕЦЦА

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас гутаркі з працоўным калектывам Аршанскага льнокамбіната. Прэзідэнт лічыць, што ў краіне даўно трэба было павышаць пенсійны ўзрост. «Але вы гэтага не хочаце. А я вам абяцаў, што, перш чым гэта рабіць, мы з вамі параімся. Але майце на ўвазе: такая будзе і пенсія», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Калі б у нас быў вышэйшы пенсійны ўзрост, то вялікую масу грошай мы маглі б дзяліць на меншую колькасць пенсіянераў, і пенсія была б значна вышэйшай. Але калі вы гэтага не хочаце — добра. Будзем шукаць іншыя шляхі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў краіне адзін пенсіянер прыпадае на 1,3 чалавека, які працуе. «Гэта ненармальна. Трэба, каб суадносіны былі хаця б 1:3», — сказаў Прэзідэнт.

ЭКАЛОГІЯ НА ДВУХ КОЛАХ

22 верасня ўвесь свет традыцыйна адзначыць Дзень без аўтамабіля

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзякуючы правядзенню гэтай міжнароднай экалагічнай акцыі атмасфернае паветра ў нашай краіне штогод пазбаўляецца ад больш чым 350 тон шкодных рэчываў.

Спадзяёмся, што і для вас гэты незвычайны вераснёвы панядзелак стане нагодай, каб пачаць тыдзень, а магчыма і жыццё, па-новаму, перасеўшы з аўтамабіля на веласіпед ці грамадскі транспарт.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Інавацыйны вектар развіцця прамысловасці — найважнейшы наш арыенцір. Не так даўно на сустрэчы з вучонымі мы гаварылі аб тым, што іх патэнцыял для развіцця вытворчасці трэба выкарыстоўваць максімальна. Бо відавочна, што той, хто стварае найноўшыя тэхналогіі, мае значна больш перспектыў для эканамічнага росту, чым той, хто вымушаны іх набываць. Дарэчы, цяпер Гродзенскі ўніверсітэт стварае адкрыты рэгіянальны банк інавацыйных прамысловых ідэй — анлайн-пляцоўку, дзе будуць сустракацца магчымасці навукоўцаў і запыты прадпрыемстваў. Лічу, што Гродна можа і павінен стаць фінансава-інфармацыйным цэнтрам. Высокатэхналагічныя (5–6-га ўзроўняў тэхналогій) інавацыйныя вытворчасці тут павінны атрымаць дынамічнае развіццё. Паказальна, што ў Гродне плануецца стварыць філіял Парка высокіх тэхналогій, які таксама будзе спрыяць прасоўванню інавацый».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 20.09.2014 г.

Долар ЗША	10540,00	▲
Еўра	13590,00	▲
Рас. руб.	274,00	▼
Укр. грыўня	771,60	▼

■ Наша марка

ЦУКАР — ГЭТА ТАК... СКЛАДАНА!

Фота БЕЛТА.

Журналістам выпала магчымасць пабываць на Слуцкім цукрарафінадным камбінаце ў гэтыя асенніе дні, калі адбываецца перапрацоўка першых партый новага ўраджаю цукровых буракоў

Вырабіць цукар — няма нічога… Правільна, больш складанага. Кожны з нас штодня спажывае цукар калі не ў булачцы, то ў мармеладзе, калі не ў ёгурце, то ў шакаладцы. Дзеці і дарослыя па некалькі разоў на дні запускаюць лыжкі ў цукарніцы і пераносяць тысячы крышталёў у кубкі з чаем-кавай-какавай. А колькі ж яны рассыпаюць міма кубкаў! Здаецца, ну і што? Нейкі там цукар — гэткая каштоўнасць… Але ж калі б вы пабывалі там, дзе гэтая каштоўнасць вырабляецца, то назвалі б празрыстыя крупінкі… белым золатам, не меней. Тое, што мы неабачліва рассыпаем на стол, праходзіць неверагодны шлях. Размова ідзе пра вельмі і вельмі цяжкую, аб'ёмную працу наймагутнага абсталявання і, вядома, людзей.

«Неверагодны» ў дадзеным выпадку не азначае, што адна цукрынка робіцца некалькі месяцаў. Ад моманту першай апрацоўкі сыравіны — цукровых буракоў — да расфасоўкі па пакетах праходзяць усяго… суткі. Але ж якія! Бурачны сок працякае за гэты час каля 50 км! І гэты бег з адной ёмістасці ў другую — кругласутачны, без выхадных і свят. З пункту гледжання эканамічнай эфектыўнасці ідэальна завяршаць перапрацоўку цукровых буракоў да студзеня, пакуль сыравіна захоўвае найбольшую колькасць цукру.

СТАР. 2

КАРАТКА

Міністэрства гандлю Беларусі прапанавала аднавіць ільготнае спажывецкае крэдытаванне фізічных асоб для набыцця айчынных тавараў.

З 1 кастрычніка ў аўтадарожных пунктах пропуску на граніцы з Латвіяй, Літвой і Польшчай часова спыняецца пешаходны рух.

Учора ў Жэневе вызначаны 13 гарадоў, якія прымуць матчы фінальнага этапу чэмпіянату Еўропы па футболе 2020 года. Мінск, які прэтэндаваў на матчы групавога этапу і сустрэчу 1/8 фіналу, у іх лік не ўвайшоў. А футбольная зборная Беларусі апусцілася на 89-е месца ў рэйтынгу ФІФА.

22 верасня, у Дзень без аўтамабіля, у Мінску ў парку імя 60-годдзя Кастрычніка высадзяць дрэвы, а каля гімназіі №19 адкрыюць велапаркоўку.

Нацыянальны фестываль бегу «Языльская дзясятка» пройдзе ў Старых Дарогах 27 верасня.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Абама адмовіў Украіне ў статусе асноўнага саюзніка ЗША па-за НАТА

Прэзідэнт ЗША Барак Абама адмовіў Украіне ў атрыманні статусу асноўнага саюзніка ЗША па-за НАТА, паведаміў украінскі прэзідэнт Пётр Парашэнка ў эфіры тэлеканала CNN. Парашэнка таксама заявіў, што дамоўленасці з ЗША не ўключаюць пастаўкі цяжкіх узбраенняў у краіну, але Украіна можа атрымаць гэтую зброю з іншых краін. Амерыканскі лідар заявіў свайму калегу аб падтрымцы дыпламатычнага ўрэгулявання ўкраінскага канфлікту. Пасля сустрэчы з Парашэнкам у Белым доме Абама распавёў, што ЗША дадуць новы пакет дапамогі Украіне.

Шатландцы не хочуць незалежнасці

У Шатландыі сталі вядомыя папярэднія вынікі рэферэндуму аб незалежнасці. Галасаванне прайшло пры рэкордна высокай яўцы выбаршчыкаў — 84,59% (галасавалі 4 млн 283 тыс. 392 чалавекі). Пасля падліку галасоў на ўсіх 32 выбарчых участках стала вядома, што за аддзяленне Шатландыі ад Вялікабрытаніі прагаласавалі 44,7% удзельнікаў рэферэндуму, супраць — 55,3%. Афіцыйна вынікі рэферэндуму пакуль не падведзены. Вядома, што толькі ў чатырох з 32 акруг прыхільнікі выхаду краіны са складу Вялікабрытаніі апынуліся ў большасці.

«Аўрора» пакідае Петраградскую набярэжную



Легендарны крэйсер «Аўрора» 21 верасня пакіне Петраградскую набярэжную ў Санкт-Пецярбургу і вернецца на месца сваёй гістарычнай стаянкі пасля рамонту, у 2016 годзе. У ходзе рамонтных работ плануецца захаваць у поўным аб'ёме гістарычныя часткі корпуса і механізмаў карабля, ставіць «Аўрору» на самастойны ход не будуць. Рамантаваць «Аўрору» будзе Краншатцкі марскі завод. Апошні маштабны рамонт на «Аўроры» праводзіўся каля 30 гадоў таму.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У Польшчы названы склад новага ўрада

Прызначаная прэм'ер-міністрам Польшчы спікер сейма Ева Копач назвала склад новага ўрада краіны. Фарміраванне новага кабінета міністраў спатрэбілася ў Польшчы пасля адстаўкі прэм'ер-міністра Дональда Туска, які быў прызначаны старшынёй Еўрапейскага савета. Ва ўрадзе Копач захавалі свае пасады многія міністры з каманды Туска. У прыватнасці, абаронным ведамствам па-ранейшаму будзе кіраваць Томаш Семаняк, які стаў таксама віцэ-прэм'ерам, міністрам дзяржказны застанецца Уладзімеж Карпінскі, а за навакольнае асяроддзе працягне адказваць Мачэй Грабоўскі. Галоўнай сенсацыяй стала з'яўленне ў кабінеце міністраў кіраўніка камісіі сейма Польшчы па замежных справах Гжэгажа Схеціны, які заняў пасаду міністра замежных спраў рэспублікі. Гэтае рашэнне здзівіла мясцовых назіральнікаў, бо Схеціна лічыцца галоўным апанентам Копач і Туска ў кіруючай партыі Грамадзянская платформа.

■ Як я быў…

БЯЗВУСЫ «НЯНЬ»

Карэспандэнт «Звязды» папрацаваў у дзіцячым садку выхавальнікам і яго памочнікам

Хто ў «Церамку» жыве?

Мая Бобіч, загадчыца садка «Церамок», што ў аграгарадку Альгова Віцебскага раёна, вельмі здзівілася званку.

— Гэта звычайны вясковы садок. Ды і дзень сёння, напэўна, не зусім добры для рэпартажу — генеральная прыборка ў нас… А вы яшчэ і папрацаваць хочаце? Ну, тады прыязджайце! — згадзілася Мая Міхайлаўна. Яна кіруе калектывам, пачынаючы з 1998 года. Да гэтага працавала ў віцебскім садку, была загадчыцай сада ў вёсцы Сасноўка. Да паступлення ў ВНУ скончыла медыцынскае вучылішча, потым біяфак Віцебскага педагагічнага інстытута (цяпер — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава.).

— У наступным годзе садку споўніцца 40 гадоў. У нас 73 дзіцяці, у тым ліку 9 — са шматдзетных сем'яў. Бацькі апошніх плацяць за харчаванне толькі палову сумы. А без льготы сёння плата — 22 тысячы 30 рублёў за дзень. Але гэта — цана чатырохразовага харчавання для дзяцей з груп 12-гадзіннага знаходжання. Тыя, хто ў садку 10 з паловай гадзін, яduць 3 разы, таму плата трохі меншая. Бацькі калісьці аплачвалі харчаванне толькі на 40%, потым на 60%, цяпер — на 100%, — расказвае загадчыца.

СТАР. 6

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

ISSN 1990 - 763X

■ Супрацоўніцтва

ВІЗА Ў ІЗРАІЛЬ БОЛЬШ НЕ ПАТРЭБНА

Учора ў Мінску прадстаўнікі Беларусі і Ізраіля заключылі міжурадавае пагадненне аб адмене віз для ўладальнікаў нацыянальных пашпартоў. Падпісанне дакумента стала вынікам прамога даручэння Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

З беларускага боку дакумент падпісаў **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ**, з ізраільскага — **міністр абсорбцыі (ведамства, якое ў Ізраілі адказвае за рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне міграцыі) Софа ЛАНДВЕР**.

Уладзімір Макей пасля цырымоніі падпісання дакумента падкрэсліў, што адмена віз істотна стымулюе развіццё двухбаковых сувязяў не толькі ў эканоміцы, але і ў іншых сферах, у тым ліку — у сферы адносін паміж звычайнымі людзьмі. Прадугледжваецца сур'ёзнае развіццё актыўнасці ў сферы турызму.

— З улікам прамых авіязносін, якія існуюць паміж краінамі, можна чакаць актыўнага развіцця сувязяў, — адзначыў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства. — Думаю, што гэта падзея сведчыць аб высокім узроўні і сяброўскім характары адносін паміж Беларуссю і Ізраілем.

Міністр замежных спраў Беларусі таксама падкрэсліў, што паміж дзвюма краінамі пастаянна ідзе актыўны дыялог. На яго думку, падпісанае пагадненне з'яўляецца істотным унёскам у беларуска-ізраільскае супрацоўніцтва. Пасля ўступлення ў сілу дакумента грамадзяне Беларусі і Ізраіля змогуць знаходзіцца на тэрыторыях нашых краін да 90 дзён за паўгода.

У сваю чаргу міністр абсорбцыі Дзяржавы Ізраіль назвала падпісанне пагаднення знамянальнай падзеяй як для беларускага, так і для ізраільскага народа. Пры гэтым Софа Ландвер адзначыла, што ў Ізраілі пражывае вельмі вялікая беларуская дыяспара. Яна нагадала, што многія вядомыя асобы Ізраіля, у тым ліку і некалькі прэзідэнтаў, паходзяць менавіта з Беларусі.

— Мы — краіны-сябры, а падпісанне пагаднення аб адмене віз узніме нашы ўзаемаадносіны на больш якасны ўзровень, — рэзюмавала Софа Ландвер.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

ДЛЯ БОЛЬШАЙ АБ'ЕКТЫЎНАСЦІ

Беларусь плануе заключыць з Кубай пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне друку і інфармацыі. Аб гэтым ішла размова на сустрэчы міністра інфармацыі Беларусі Ліліі Ананіч з паслом Кубы ў Беларусі Херарда Суарэсам Альварэсам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Мінінфарма.

Лілія Ананіч праінфармавала кубінскі бок аб развіцці сферы друку і інфармацыі Беларусі і адзначыла важнасць інфармацыйнага супрацоўніцтва ў кантэксце дынамікі адносін дзвюх краін. Міністр падкрэсліла важнасць заключэння міжурадавага пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне друку і інфармацыі. Кубінскаму боку была перададзена адпаведная нота і праект дакумента. У час сустрэчы абмяркоўваліся практычныя пытанні ўдзелу сродкаў масавай інфармацыі і выдавецкіх структур Кубы ў Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, Беларускім міжнародным медыяфоруме «Партнёрства ў імя будучыні». Херарда Суарэс Альварэс пацвердзіў гатоўнасць кубінскага боку да актывізацыі супрацоўніцтва ў мэтах аб'ектыўнага інфармавання аб працэсах, што адбываюцца ў абедзвюх краінах.

ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ РАСЦЕ ХУТЧЭЙ ЗА ВУП

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі за студзень—жнівень павялічыўся на 1,5% у параўнанні з аналагічным перыядам 2013 года, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.

У той жа час прадукцыйнасць працы па ВУП (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) вырасла на 3,1% у параўнанні з васьмю месяцамі мінулага года. Акрамя таго, зварухнулася з месца прамывытворчасць: выраблена на 0,3% больш, чым за аналагічны перыяд 2013 года. На 4% вырасла вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Нацыянальнае багацце

КАРАНІ І КРОНЫ

За пяць гадоў плошча лясоў, пацярпелых ад пажараў, зменшылася ў дзесяць разоў

21 верасня прадстаўнікі лясного комплексу Беларусі чарговы раз адзначаць Дзень работнікаў лесу. З якімі дасягненнямі і планамі прыйдуць ахоўнікі аднаго з галоўных нацыянальных скарбаў да свайго прафесійнага свята?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як адзначыў **міністр лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь Міхаіл АМЕЛЬЯНОВІЧ**, сёлета было забяспечана выкананне ўсіх паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця лясной галіны. Але самае галоўнае дасягненне лясных вартаўнікоў — нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, работнікі лесу пры падтрымцы МНС і органаў мясцовай улады змаглі зберагчы лес ад пажараў. Сёлета плошча лясоў, пацярпелых ад агню, склала ўсяго 170 га, што амаль у дзесяць разоў менш, чым у 2009 годзе.

Штогод у краіне ствараецца больш за 23 тыс. га новых лясоў, што патрабуе 200 млн штук пасадачнага матэрыялу. Адным з галоўных кірункаў развіцця гадавальніцкай гаспадаркі ў Беларусі на бліжэйшыя гады выбрана павышэнне аб'ёму вырошчвання пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай. Па словах міністра, у 2020 годзе 30% тэрыторыі стварэння лясных культур патрэбна забяспечыць пасадачным матэрыялам з закрытай каранёвай сістэмай. Для гэтага спецыялісты плануюць пабудаваць 23 тыс. м² цяпліц і чатыры лясныя селекцыйна-насенняводчыя цэнтры.

За апошнія гады назіраецца рост аб'ёмаў рэалізацыі прадукцыі на экспарт. За мінулы год лясная гаспадарка зарабіла 145 млн долараў ЗША на экспарце тавараў, што на 37% больш у параўнанні з 2010 годам. За шэсць месяцаў 2014-га гэты паказчык склаў 90 млн долараў, а ў канцы года павінен дасягнуць 160 млн.

Прадугледжаны ў нашай краіне і паэтапны пераход ад рэалізацыі драўніны на корані да рэалізацыі драўніны ў нарыхтаваным выглядзе. Сёлета праз біржавыя таргі плануецца рэалізаваць 25% драўніны на корані, а з 2015 года ўся беларуская драўніна пачне прадавацца толькі ў нарыхтаваным выглядзе. Гэта дапаможа павысіць эфектыўнасць выкарыстання лясных рэсурсаў нашай краіны.

— Нашы спецыялісты працуюць над укараненнем сучасных тэхналогій для размнажэння такіх складаных для гэтай справы відаў, як елка і сасна звычайныя, — расказаў міністр лясной гаспадаркі. — У 2015-2017 гадах гэтае пытанне павінна быць вырашана, што дасць магчымасць падняць на больш высокі ўзровень усю сістэму лесааднаўлення Беларусі.

Паступова развіваецца ў нашай краіне і лесанарыхтоўчая галіна. Сёння гэтай дзейнасцю паспяхова займаюцца пяць сумесных кампаній з замежным капіталам, у склад якіх уваходзяць прадпрыемствы Мінлясгаса. Чакаюць тут і іншых прадстаўнікоў прыватнага бізнесу.

Адным з важных напрамкаў дзейнасці лясной гаспадаркі Беларусі міністр таксама лічыць будаўніцтва лясных дарог, без чаго немагчыма павялічваць аб'ёмы лесанарыхтовак. Важнае значэнне яны маюць і для ліквідацыі і тушэння лясных пажараў, дастаўкі лесаводаў на цяжкадаступныя ўчасткі. У наступныя пяць гадоў у Беларусі будзе пабудаваны 641 км лесагаспадарчых дарог, у тым ліку 136 км — да канца 2014 года.

Вераніка КОЛАСАВА

■

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Плошча земляў лясного фонду ў Беларусі складае 9,5 млн га.

За апошнія пяць гадоў лясістасць тэрыторыі краіны павялічылася на 1%.

Агульны запас драўніны на корані ацэньваецца ў 1,7 млрд куб. м.

ЦУКАР — ГЭТА ТАК...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Слуцкі камбінат — унікальны. У Беларусі наогул цукровую галіну прадстаўляюць, акрамя яго, яшчэ тры падобныя прадпрыемствы — адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Скідзельскі цукровы камбінат», «Гарадзейскі цукровы камбінат», «Жабінкаўскі цукровы завод». Усе працягваюць мадэрнізацыю. І не столькі для павелічэння магутнасцяў — па вялікім рахунку, яны і без таго немалыя, — колькі дзеля павелічэння эканамічнай эфектыўнасці, эканоміі тых жа энергазатрат.

— Сёння вытворчыя магутнасці завода — 8 тысяч тон перапрацоўкі цукровых буракоў за суткі, — кажа **старшыня назіральнага савета ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат» Восіп ДАПІРА.** — Пасля рэканструкцыі, да канца наступнага года, нашы магутнасці складуць 10 тысяч тон. Усе цукровыя арганізацыі краіны будуць выходзіць на такія аб'ёмы. Заводы з падобнай магутнасцю ёсць і ў блізкім замежжы, аднак разам з тым яны істотна саступаюць па тэхналагічных паказчыках, расходзе цеплаэнергіі, вытворчых стратах і г.д. Слуцкі камбінат трэці год запар прызнаецца лепшым у галіне на тэрыторыі Мытнага саюза...

ПАВЕРЦЕ на слова, апісаць падрабязнасці вырабу цукру немагчыма. Прынамсі, журналісту. Тым больш на старонках перыядычнага выдання. Бо гэта — суцэльная тэхналогія, хімічныя працэсы. А ў мяне з хіміяй яшчэ са школы нелады. Так што я абмалюю сітуацыю коратка і ў агульных рысах.

Вось гэтая плошча з гурбамі (*глядзіце фота на 1-й стар.*), якія нагадваюць егіпецкія піраміды, называецца кагатным полем. Яно, мякка кажучы, вялікае, а таму свабодна прасціраецца на ўскрайку Слуцка, дзе якраз можа быць так шумна і пыльна. Дарэчы, вы калі-небудзь бачылі цукровы бурак? Ён белы. Белы ўсярэдзіне, брудны звонку — усё ж не на дрэвах расце. І па памеры гэтая гародніна зусім не дробненькая. А па «фігуры» — штосьці такое грушападобнае.

Нагружаныя гэтымі «грушамі» (здалёк, праўда, здаецца, што камянямі) машыны адна за адной прыбываюць (а прыбываць яны могуць са 108-і гаспадарак, размешчаных не толькі ў самой Мінскай вобласці) на пункт бракоўкі, дзе можна візуальна ацаніць памер і забруджанасць партыі перад тым, як накіраваць вадзіцеля на разгрузку. Размова можа ісці аб працяглым ці кароткатэрміновым захоўванні або накіроўванні адразу на перапрацоўку. У сыравіннай лабараторыі літаральна за 10 хвілін ставяць «дыягназ» — якая цукрыстасць, забруджанасць. Цукрыстасць вагаецца сёння ад 14 да 16 працэнтаў.

Машына разгружаецца проста на гэтым кагатным полі. Пад адкрытым небам. А дзе яшчэ вы хочаце выгрузіць мільён тон буракоў? Сыравіна, чарга якой надышла ператварацца ў белае золата, падаецца вадой на завод па спецыяльных гідратранспарцёрах. Яны хоць і падземныя, але не закрытыя на ўсім сваім працягу. Таму ёсць магчымасць перацярпець моцны шум і грукат, каб пабачыць, як велізарныя буракі бурляць у патоках вады, пазбаўляючыся па дарозе ад камянёў і саломы. У гідратранспарцёры сыравіна і рухаецца, і збольшага адмываецца, а на заводзе праходзіць далейшае адмысловае мыццё.

Далей — самае складанае. Спачатку атрымліваюць цукровую стружку. Потым дыфузійная, высачэзная 38-метровая ўстаноўка высалоджвае (можна сказаць, адбірае) цукар з гэтай стружкі. Працэс перадачы досыць мокры. Высалоджванне адбываецца ў ваду, а таму атрымліваецца не цукар, а сок. Яго ачышчаюць ад розных непатрэбных рэчываў (назавём гэта прымесямі). Пераказаць, што там уключае ў сябе працэс ачысткі, і не прасіце. Проста ведайце, што гэты працэс дае сок светла-жоўтага колеру, які змяшчае 13-14 працэнтаў сухога рэчыва. Такі раствор паступае на выпарную станцыю, каб атрымаць колькасць сухіх рэчываў 72-74 працэнты. Адбываецца гэтае пераўтварэнне ў шэсць этапаў на станцыі выпарвання! Цяпер у нас ёсць густы сіроп, які павінен урэшце стаць крышталямі. Вырашчаныя, як тут кажуць, крышталі яшчэ не белыя. Каб стаць белымі, ім трэба пабоўтацца ў спецыяльнай цэнтрыфузе. Усё. Сушым іх, ахалоджваем і фасуем.

У мяне і цяпер перад вачыма карціна, калі буракі «залятаюць» у патоках вады па транспарцёры ў крытае памяшканне завода. Гэта нагадвае землятрус, падчас якога дрыжыць жалезная падлога, на якой ты стаіш і адчуваеш сябе саломінкай. У дадатак тут стаіць грукат — работнікі, праўда, спакойна адсочваюць працэс. Неабдымнае абсталяванне шуміць так, што чалавечы голас, нават узмоцнены да крыку, цяжка пачуць.

— ДЛЯ вырабу цукру ў свеце выкарыстоўваюцца два віды сыравіны — трысняг і цукровыя буракі, — тлумачыць **галоўны тэхнолаг камбіната Юрый ТРЫКО.** — У свеце трыснёг актыўна перапрацоўваюць у Бразіліі, Паўднёвай Амерыцы, Аргенціне... Атрымліваюць сырцовы цукар жоўта-карычневага колеру. У выніку далейшай яго перапрацоўкі можна вырабіць белы цукар, нічым не горшы за бурачны. Айчынныя прадпрыемствы таксама выпускаюць трысняговы цукар. Колькасць цукрозы ў цукры — 99,6-99,9%, незалежна ад яго паходжання. Цукроза — самае каштоўнае, што ёсць у цукры. Як вядома, мінералаў там няма. Як і вітамінаў.

Часам вы можаце бачыць, што цукровыя крышталікі бываюць і дробнымі (самая дробная фракцыя — гэта ўжо цукровая пудра), і буйнейшымі. Спажыўцы не павінны палохацца. Тэарэтычна, як паўсюдна ў Еўропе, можна выпускаць цукар сямі фракцый, на нашым заводзе вырабляецца чатыры з іх.

Святлана БАРЫСЕНКА.

НА ЛЮБЫ ГУСТ

Цукровыя прадпрыемствы прапануюць пакупнікам розныя віды сучаснай расфасоўкі: па 5; 3; 2; 1; 0,9; 0,45 кг у папяровых і поліэтыленавых пакетах. Выпускаецца і парцыённы цукар — па 5 і 10 г.

У Гарадзеі, Слуцку і Скідзелі вырабляюць прасаваны цукар з расфасоўкай па 1 і 0,5 кг. Дарэчы, такі прадукт робіцца з дапамогай спецыяльнай установкі, якая ўвільгатняе «крупінкі» і тым самым прымушае іх зліпацца. Гарадзейскі цукровы камбінат прапануе прасаваны цукар у форме «брыдж» (форма картачных масцей), а таксама з карыцай, вітамінам С і лімонам.

Ёсць і цукар у форме ледзяша на палачцы (Гарадзея). Жэліруючы цукар прызначаны для хатніх нарыхтовак (Жабінка). У продажы можна сустрэць і буйнакрышталічны цукар, а яшчэ ўзбагачаны ёдам, селенам, вітамінам Е, фоліевай кіслатой (Жабінка). Слуцк пастаўляе прадпрыемствам цукар і пудру ў біг-бэгах па 1 т.

■ Курсавая розніца

ЕЎРА БУДЗЕ ТАННЕЦЬ

А расійскі рубель чакае ацяпляльнага сезона

Тэндэнцыі апошняга часу на сусветным і айчынным валютных рынках карэспандэнту «Звязды» растлумачыў эксперт кампаніі «ТэлеТрэйд-Беларусь» Міхаіл ГРАЧОЎ.

У СВЕЦЕ

Апошнія тыдні былі адзначаны істотным умацаваннем курсу долара ЗША. «Прычым гэты рост адбываўся не толькі ў дачыненні да еўра, але і да асноўных сусветных валют, — сцвярджае эксперт. — Адлюстраваннем гэтага з'яўляецца рост індэкса DXY (долар да кошыка шасці сусветных валют). Так, 17 верасня гэтага года індэкс дасягаў максімуму з сакавіка бягучага года. У тым жа трэндзе знаходзілася і пара еўра/долар, якая са значэння 1,38 у канцы красавіка панізілася да 1,28 на 18 верасня. Абумоўлена гэта было ўмацаваннем амерыканскай эканомікі і негатыўнымі паказчыкамі эканомікі Еўрасаюза». Вельмі значнай падзеяй стала пасяджэнне камітэта па адкрытых рынках ФРС ЗША. Па словах Міхаіла Грачова, прынятыя рашэнні (аб пакіданні асноўнай стаўкі на ўзроўні 0,25% і згортванні праграмы колькаснага змякчэння з кастрычніка 2014 года) пацвердзілі прагнозы на далейшае ўмацаванне долара ў найбліжэйшай будучыні. «Таму да канца года магчыма паніжэння курсу EUR/USD да 1,21 і да канца 2015 года — да 1,10».

Не надта шыкоўна адчувае сябе ўкраінская грыўна. Валюта суседняй краіны праз наступствы палітычнага крызісу, які прывёў да ваенных дзеянняў і эканамічных праблем, стала імкліва таннець. «Зніжэнне курсу грыўны да долара было значным: з 8,221 на 1 студзеня 2014 года да максімальнага 13,757 на 17 верасня. Адназначна, усе далейшыя змены будуць звязаны толькі з урэгуляваннем палітычнай сітуацыі», — заяўляе эксперт.

Праблемы апошнім часам і ў расійскага рубля. Асноўнымі прычынамі рэзкага панікавання курсу «драўлянага» сталі эканамічныя санкцыі, прынятыя ЗША і краінамі Еўрасаюза, і падзенне кошту нафты з канца жніўня. «У выніку санкцый спекулятыўны капітал выводзіць актывы з расійскай эканомікі. Падзенне коштаў на нафту абумоўлена павелічэннем здабычы сланцавых вуглевадародаў у ЗША, некаторай стабілізацыяй сітуацыі з пастаўкамі нафты з Лівіі і Ірака і зніжэннем тэмпаў росту ВУП у Кітаі». З іншага боку, павышэнне курсу долара прывяло да павелічэння паступленняў у бюджэт Расійскай Федэрацыі, і, паводле звестак Міністэрства фінансаў РФ, прафіцыт за студзень—жнівень склаў 906,516 млрд рублёў, або 2,2% ад ВУП. «Вось так дэвальвацыя ва ўмовах экспартаарыентаванай эканомікі дае станоўчыя вынікі, — канстатуе аналітык. — Адмена санкцый у выпадку стабілізацыі палітычнага крызісу ва Украіне і павышэнне коштаў на вуглевадароды з надыходам ацяпляльнага сезона, безумоўна, прывядзе да ўмацавання расійскай валюты».

У БЕЛАРУСІ

Зніжэнне курсу беларускага рубля праходзіць у рамках абвешчанай Нацыянальным банкам плаўнай дэвальвацыі. «Палітыка рэгулятара вядзе да павелічэння рублёвай даходнасці прадпрыемстваў-экспарцёраў. А гэта, у сваю чаргу, вядзе да большага напаўнення бюджэту краіны, — разважае Міхаіл Грачоў. — Па выніковых звестках першага паўгоддзя, прырост рэальнага ВУП склаў 1,6%. Адзначаны рост у хімічнай і горназдабыўнай прамысловасці, што павінна даць павелічэнне ВУП па выніках года. Усё гэта, у сукупнасці з крэдытамі ўрада Расійскай Федэрацыі, дае падставы бачыць курс беларускага рубля ў дачыненні да долара ЗША ў раёне 10800 рублёў за долар».

За апошні тыдзень еўра падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,2%) да 13590. Долар таксама вырас — на 50 рублёў (плюс 0,5%) да 10540. Расійскі рубель страціў адразу 5 грашовых адзінак (мінус 1,8%) да 274.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

Кіроўца памёр за рулём

Здарэнне адбылося ў сталіцы каля поўначы па вуліцы Арлоўскай. Відавочна, 54-гадоваму кіроўцу аўтобуса маршруту №19 «ДС Карастаянавай» — Сляпянка» стала дрэнна падчас руху, паведамляе Мінскае гарадское ўпраўленне МНС. З-за рэзкага пагаршэння самаадчування ён наехаў на прыпыначны пункт. Работнікі хуткай дапамогі правялі рэанімацыйныя мерапрыемствы і канстатавалі смерць мужчыны. Мяркуецца, што ўсяму прычынай стаў сардэчны прыступ.

Сяргей РАСОЛЬКА.



kosht.info

■ Тэхналогіі

ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА ВЫДАЧУ ПАШПАРТА «ПА-СУЧАСНАМУ»

З 19 верасня Міністэрства ўнутраных спраў і Нацыянальны банк падключылі да Адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы паслугі, якія аказваюцца падраздзяленнямі па грамадзянстве і міграцыі УУС Мінаблвыканкама. Нагадаем, што аналагічныя паслугі па Мінску прайшлі ўкараненне ў маі сёлетняга года.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, заплаціць з выкарыстаннем інтэрнэт-банкінгу, мабільнага банкінгу, інфакіёскаў і іншых прылад цяпер можна за выдачу і абмен пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, паскораную выдачу і абмен пашпарта, афармленне заявы, атрыманне SMS-паведамлення аб гатоўнасці дакумента да выдачы, а таксама за рэгістрацыю часовага знаходжання замежных грамадзян і грамадзян без грамадзянства.

Спасылкі на пералічаныя паслугі падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі ў «дрэве» Адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы размешчаны адпаведна ў «галінах» «горад Мінск» і «Мінская вобласць».

Грамадзяне Беларусі пры аплаце ў сістэме адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы абавязкова ўводзяць свой ідэнтыфікацыйны (асабісты) нумар, указаны ў пашпарце, а іншаземцы — нумар пашпарта, па якім яны ўязджалі ў Рэспубліку Беларусь.

Пры падачы дакументаў у падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі ці ўпаўнаважанай на прыём дакументаў асобе неабходна паведаміць гэтыя звесткі (ідэнтыфікацыйны нумар, нумар пашпарта) або нумар аперацыі ў Адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы, які выдаецца прыладай аплаты па выніках плацяжу, а таксама зрабіць адпаведную адзнаку ў заяве.

У будучыні плануецца распаўсюдзіць такі спосаб аплаты на ўсе рэгіёны краіны — з павелічэннем пераліку паслуг, якія аплачваюцца праз Адзіную разліковую і інфармацыйную прастору.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ЦЯГНІК ІМГНЕННА НЕ СПЫНІШ...

З 19 па 28 верасня Беларуская чыгунка правядзе дэкаду па папярэджанні невытворчага траўматызму. Асаблівая ўвага будзе нададзена выяўленню прычын і ўмоў, якія садзейнічалі траўмаванню і гібелі грамадзян, прыняцці мер па іх выкараненні. Таксама на станцыях праверацъ спраўнасць сістэм аўтаматычнага апавяшчэння пасажыраў.

Прычынай павышанай увагі да пытання бяспекі людзей на аб'ектах чыгуначнага транспарту стаў рост колькасці няшчасных выпадкаў, не звязаных з вытворчасцю. Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, з пачатку года на Беларускай чыгунцы адбылося 137 выпадкаў траўмавання і гібелі людзей. Пацярпелі 139 чалавек, што на 17 больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. З агульнай колькасці пацярпелых смяротна былі траўмаваны 94 чалавекі, у той час як летась — 84.

Найбольш неспрыяльная абстаноўка склалася па Мінскім аддзяленні. Тут у верасні адбылося 7 з 14 выпадкаў, зарэгістраваных на дарозе, з іх 6 — са смяротным зыходам. Усяго з пачатку сёлетняга года па Мінскім аддзяленні адбылося 68 выпадкаў невытворчага траўматызму — 50 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОАО «Амкодор-Дзержинск»

222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19
Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 1 октября 2014 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, кабинет директора Общества.

Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании – 24 сентября 2014 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О результатах закрытой подписки на дополнительные акции ОАО «Амкодор-Дзержинск».
2. Об утверждении решения о выпуске акций ОАО «Амкодор-Дзержинск».
3. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Амкодор-Дзержинск».
4. О внесении изменений в устав ОАО «Амкодор-Дзержинск».

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 19 сентября 2014 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 24 сентября 2014 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 600005769 *Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»*

В связи с утерей **считать недействительной** печать ООО «Далленг» (для документов) (г. Минск). УНП 191468246

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
►**ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже
автомобиля ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР Комби Т5 1,9 TDI, г.в. – 2005.

Начальная цена с НДС – 136 000 000 бел. руб. Задаток с НДС – 13 600 000 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов», **проводимом 3 октября 2014 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в течение 3 (трех) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 6% (шести процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 03.10.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 1%.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.10.2014 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2014.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 28 (245)

ДОМ, ДЗЕ ЯДНАЮЦЦА СЭРЦЫ

Пошукі спадчыны Янкі Купалы не спыняюцца ўжо 70 гадоў

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы жыве даўжэй, чым працягвалася жыццё самога паэта — установе сёлета спаўняецца 70 гадоў. Гэты юбілей азначае, што спадчына незвычайнага таленту нашага земляка больш магутная, чым адчувальнае, рэальнае жыццё. Гэта значыць, што паэзія, драматургія і пераклады Купалы — невыпадковыя, і яны нязменна ўплецены ў беларускую культуру і свядомасць. Гэта значыць, што музею, нягледзячы на крыўдныя страты архіваў і бібліятэкі песняра, да гэтага часу ёсць што паказаць унікальнага, аўтэнтычнага, таго, да чаго дакранаўся класік.

У свой час Янка Купала быў магнітам, цэнтрам, вакол якога арганізоўвалася літаратурнае жыццё краіны. Яго паэзія захапляла, натхняла і давала пачуццё ўпэўненасці ў сваім беларускім самавызначэнні. І зараз дом-музей у цэнтры жывапіснага сталічнага парку не перастае сустракаць гасцей, збіраць у сваіх сценах майстроў слова і яго аматараў.

Ёсць падстава зноў зазірнуць у літаратурны музей дзеля выстаўкі «Майго жыцця бяссмертны цень», якая прысвечана 70-годдзю з дня заснавання літаратурнага музея Янкі Купалы. Адкрыццё, якое адбылося 19 верасня, прымеркавана да юбілейных урачыстасцяў «Яшчэ адзін крок наперад!». Трэба ўзгадаць, што прыгожы ўзноўлены дом — гэта не першапачатковае месца ўшанавання паэта. Рэтраспектыўны раздзел выстаўкі пакажа першую стацыянарную экспазіцыю музея Янкі Купалы, што была адкрыта ў 1945 годзе на трэцім паверсе Дома прафсаюзаў: прыжыццёвыя выданні твораў класіка, аўтографы, арыгінальныя фотаздымкі і асабістыя рэчы паэта. Асобна можна ўбачыць рэчы, некалі знойдзеныя на папялішчы купалавага дома, які згарэў яшчэ ў пачатку вайны.

Раздзел выставы «Збіральнікі і захавальнікі» раскажа пра тых, хто стаў паслядоўнікамі Уладзіслава Францаўны Луцэвіч, жонкі паэта і самага адданага чалавека справе захавання спадчыны. Сярод людзей, якія заўсёды ствараліся з музея культурна-асветніцкі цэнтр, былі навукоўцы і пісьменнікі Іосіф Жыдовіч, Янка Шарахоўскі, літаратуразнавец і крытык Уладзімір Юрэвіч, Аляксандр Есакоў, Алесь Бажко, Аляксей Кулакоўскі, траюрадная пляменніца паэта Жанна Дапкюнас.

Раздзел «Дзень сённяшні» пакажа, што пошукі слядоў класіка не павінны быць спынены: апошнія паступленні ў літаратурны музей Янкі Купалы ўключаюць кнігі з аўтографамі Янкі Купалы, адшуканыя ў 2012 годзе, падарункі мастакоў, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў ды проста неабыякавых людзей.

Гісторыя жыцця паэта абрасла шматлікімі легендамі, якім можна верыць ці не выказваць здагадкі, версіі; у біяграфіі класіка для нас шмат прабелаў, шмат інтрыгуючых, загадкавых месцаў, таму праца музея яшчэ больш каштоўная: яна можа паказаць нам тое нямногае — жывое, матэрыяльнае, шматзначнае — што захавалася.

«МУЗЕЙ ЯК РОДНЫ ДОМ»

Вячаслаў РАГОЙША, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

— Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы — вядучая ўстанова Беларусі сярод літаратурных музеяў. Ён быў такім на пачатку, і такім жа застаецца цяпер. Хоць і пасля яго стварэння ўзніклі іншыя музеі, у прыватнасці, літаратурны музей Якуба Коласа ці музей гісторыі беларускай літаратуры. Памятаю, калі я быў студэнтам, на адным курсе са мной вучылася Жанна Казіміраўна Каспяровіч (Дапкюнас), будучая супрацоўніца і дырэктар музея амаль на працягу дваццаці гадоў. Яна ж траюрадная пляменніца Янкі Купалы, блізкая сваячка цёткі Уладзі, то бок Уладзіславы Францаўны Луцэвіч, жонкі Купалы. У 1958 годзе праз Жанну Казіміраўну мы звязаліся з Уладзіславай Францаўнай і яна зрабіла так, што на суботніках (а тады ў студэнтаў пастаянна ладзіліся суботнікі) мы сталі працаваць на будоўлі дома-музея Янкі Купалы. На жаль, цётка Уладзя не дажыла да адкрыцця музея, а мы там былі. Бачылі Пятра Глебку, Івана Шамякіна і іншых выдатных пісьменнікаў. Так сталася, што з музеем я кантактаваў увесь гэты час. У 1996 годзе стварыўся міжнародны фонд Янкі Купалы, мяне выбралі старшынёй фонду, намесніцай стала Жанна Казіміраўна. Музей з дапамогай фонду выдаў у свой час цікавыя каталогі рукапісаў Янкі Купалы. Толькі гэты музей у Беларусі можа пахваліцца такімі каталогамі, ды і іншымі набыткамі таксама. У апошнія гады ў музеі створаны зусім новыя экспазіцыі, зробленыя з дапамогай найноўшых тэхналогій. Калі прыязджаюць госці, яны ў захапленні, бо мала дзе літаратурныя матэрыялы экспануюцца на такім тэхнічным узроўні і з такой любоўю. Я лічу, што не толькі ў музейнай, але і ў культурнай прасторы Беларусі літаратурны музей Янкі Купалы — выдатны асяродак, якім можа ганарыцца ўся Беларусь.

Віктар ШНІП, паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

— Музей імя Янкі Купалы для мяне як родны дом. Я нарадзіўся ў дзесяці кіламетрах ад Вязынкі, адкуль родам паэт, там жа знаходзіцца філіял музея Янкі Купалы, а ў ім — яго калыска. Сам жа музей таксама родны для ўсіх беларусаў, якія ганарацца імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча... Яго стварэнне 70 гадоў таму — гэта вялікая заслуга цёткі Уладзі, жонкі паэта, таксама маёй зямлячкі, чым я ганарусь. Усе нашы дарогі рана ці позна праходзяць праз гэтае месца. А хто тут не быў — павінен пабываць, і неаднойчы, каб зразумець, хто мы такія.

Я заўсёды з радасцю прыходжу і ўдзельнічаю ў імпрэзах, якія адбываюцца ў музеі. Тут працуюць людзі, адданыя сваёй прафесіі, яны бераўліва адносяцца да твораў, спадчыны класіка, да яго імя. У нас ёсць тры кіты: музеі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Зразумела, ёсць музей гісторыі літаратуры, але калі б не было Купалы...

Літаратурны музей імя Янкі Купалы будзе і 700 гадоў існаваць, бо гэтая спадчына не страчвае, а толькі набывае каштоўнасць. Тут карані нашай паэзіі, культуры, класікі. Пройдзе 100, 200, 300 гадоў, але музей не знікне: будзе пашырацца, узбагачацца, а імя Купалы будзе вышэй і вышэй.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

«ТЭАРТ» І ВАКОЛ,

альбо Як мастацтва мяняе чалавека

Аднойчы гэта здараецца. Ты проста сядзіш у зале, глядзіш на сцэну, адкуль у твой бок ляцяць словы, погляды, якія ўцягваюць у дзеянне. Яны могуць так «прыпячатаць» да крэсла, што нямее ўсё цела, і ты скаваны: актыўная толькі свядомасць, якая чуйна адгукаецца, прымае альбо імкнецца абвергнуць пачутае і ўбачанае. І ты сядзіш, але ўсё роўна становішся саўдзельнікам, таму што прымаеш гэтыя словы і погляды альбо тут жа ў думках імкнешся адказаць. І больш нічога няма — ты і гэтая сцэна, на якой адбываецца нешта такое, што прарывае, разрывае тваё спакойнае існаванне, рве на шматкі душу, каб потым ты думаў, як яе скласці наноў з гэтых кавалачкаў эмоцый: што пакінуць, а што выдаліць, выкінуць...

Свет спыняецца. Зямля не круціцца ў гэты момант (так здаецца, бо няма нічога больш важнага цяпер, чым тое, што адбываецца тут і з табой). І разумееш: наогул няма нічога больш важнага, чым тое, што ёсць ты, што ты адчуваеш, што думаеш пра свет і сваё з'яўленне ў ім. І калі ўсё скончана — акцёры выйшлі на паклон і машынальна ты яшчэ ім пляскаеш — не можаш кіраваць сабой, бо кіруе ўсё яшчэ тое ўбачанае, нечаканае, што перавярнула і змяніла за нейкую гадзіну-дзве.

Так і хочацца сказаць мэтарскім тонам: хто не перажыў падобнага ў тэатры, той тэатра не ведае. Але я магла б гэта сказаць і не мэтарскім тонам, а як звычайны глядач, які аднойчы з тэатра выйшаў іншым чалавекам, перажыўшы катарсіс: гэта дзівоснае мастацтва (калі хочаце — чараўніцтва), якое ствараецца ў цябе на вачах (кожны раз новае, незалежна ад таго, каторы раз паказваецца спектакль), яно ствараецца для цябе (незалежна ад колькасці людзей у зале), і правакуе на ўнутраны дыялог. Добры тэатр.

Адноўчы адчуўшы гэта, я ўвесь час шукаю менавіта такога тэатра. Быў час, імкнулася шукаць гэта далёка, калі даводзілася глядзець спектаклі за межамі Беларусі, альбо калі да нас прыязджалі тэатры са спектаклямі знакавых рэжысёраў з паказамі выдатных пастановак, бо менавіта той спектакль, які назаўсёды зрабіў мяне аматаркай тэатра, быў гастрольны. А потым прыйшло іншае пытанне: а ці могуць вось так здзівіць, «прыпячатаць» і перавярнуць свядомасць айчынныя тэатры? Аказалася, могуць: кожны па-свойму клапоціцца пра гэта — інакш сядзелі б без публікі, яна ў беларускіх тэатрах ёсць. І могуць (у сэнсе, ёсць каму і чым) час ад часу ашаламіць і ўдарыць па свядомасці праз сэнс і новыя формы (якія, можа быць, здзіўляюць вонкава, але гэтая вонкавасць вельмі звязана з тым, каб падкрэсліць сэнс).

Хоць немагчыма ўсё-такі не агаварыцца: у чаканні пастановак — іншых, з пошукам — можна было жыць гадамі. Гэта я пра айчынную тэатральную прастору, якая ў асноўным усё ж прасякнута духам традыцыі. Гэта добры дух, ён патрэбен і справу сваю таксама робіць. Але жыццё мяняецца, і хочацца іншага тэатра, які дапаможа зноў і зноў рабіць рэвізію свядомасці з яе ўспрыманнем сучаснасці. Прычым той, якая навокал, то бок айчыннай. І хочацца не мне адной.

Мы пакаштавалі нечага іншага — і захацелася звярнуцца да свайго, зрабіць яго больш разнастайным.

Таму, калі ў праграме міжнароднага тэатральнага форуму «ТэАрт» з'явіўся блок сучаснай беларускай драматургіі, гэта падалося, можа быць, больш важным, чым папярэднія фестывалі, арыентаваныя на замежныя пастаноўкі. Яны таксама былі патрэбны і зрабілі сваю справу. Па-першае, выяўлялі публіку, якая шукае і чакае ад тэатра ўзрушэння. Знайшлі. Выявілі тых, хто ёсць, і нават (гэта ўжо па-другое) падрыхтавалі свайго гледача, з адпаведным густам і патрабаваннямі да якасці пастановак. І трэцяе: прывазныя замежныя спектаклі сталі штуршком для развіцця і пошуку айчынных творцаў, якім (як аказалася!) ёсць што сказаць. Чацвёрты клопат: дбаць пра тое, у якіх формах і праявах сучаснасць можа прыходзіць са сцэны да гледача.

«Наша задача — надаваць увагу недзяржаўным тэатрам, паказаць маладых, таленавітых асоб, якія чакаюць новага погляду на рэчы і з'явы рэчаіснасці. Ёсць глядач, які да гэтага гатовы, але мы не імкнуліся ісці за гледачом, наадварот, глядач павінен падцягвацца, выхоўвацца не маўклівым спажыўцом творчага прадукту, а разважлівым чалавекам, які думае і скіраваны на пошук і эксперымент як рухавік развіцця, — адзначае **Анжаліка КРАШЭЎСКАЯ, дырэктар Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн»**, які ў партнёрстве з «Белгазпрамбанкам» заснаваў і арганізоўвае «ТэАрт».

Тут хацелася б адзначыць: сапраўды, гэта не адзіны тэатральны фестываль у Беларусі. Ёсць і фестываль беларускай драматургіі, ёсць і міжнародныя — кшталту «Панарамы» ці «Белай вежы». Ёсць, урэшце, Нацыянальная тэатральная прэмія. І ўсе — патрэбныя, запатрабаваныя, карыстаюцца павагай. Чаму ж такая ўвага «ТэАрту», які пачнецца напрыканцы верасня?

Ён, знаёмячы з выдатнымі ўзорамі замежнага мастацтва (а ў праграме сёлета, напрыклад, пастаноўкі Алвіса Херманіса, Оскараса Каршуноваса), дбае пра айчынную інтэлектуальную і проста чалавечую прастору. Але акрамя таго, у гэтай беларускай грамадскай прасторы ёсць з'явы, на якія чуйна рэагуе мастацтва, у тым ліку тэатральнае. З-за таго, што ёсць патрэба рабіць і ствараць, узнікаюць маленькія тэатры, асобныя праекты ці творцы, якім хочацца выказацца з нагоды таго, што адбываецца навокал. Гэта тыя зрухі ў беларускім тэатры, якія не так проста заўважыць: яны недзе далёка ці глыбока схаваныя, да гледача ім не так проста не тое што дастукацца — наогул выйсці. Але ёсць тэатральны рух, які абапіраецца на разважанні пра сучаснае жыццё і чалавека ў гэтым свеце; рух, знітаваны з грамадскай прасторай. Ён яе адлюстроўвае, асэнсоўвае і шукае адказы на пытанні. Вось чаму тэатр падаецца мне вельмі магутным мастацтвам па магчымасці ўздзейнічаць на чалавека, мяняючы тым самым грамадства. Для мяне тут самае важнае, што гэта грамадства беларускае.

Жыццё мяняецца, і хочацца іншага тэатра, які дапаможа зноў і зноў рабіць рэвізію свядомасці з яе ўспрыманнем сучаснасці.

— Толькі ў Мінску ў нас ёсць жывая, незалежная культурная сцэна, якая развіваецца. І праз нашу праграму сёлета мы хочам яе адкрыць у першую чаргу для саміх беларусаў, якія ва ўмовах нашай інфармацыйнай прасторы не ведаюць, што адбываецца ў суседнім пад'ездзе, — разважае **Аляксей СТРЭЛЬНІКАЎ, каардынатар «беларускай» праграмы форуму**. — Мы звярнуліся да тэатральнай супольнасці. Да Вячаслава Іназемцава і цікавага праекта «Пластформа», які будзе прадстаўлены ў рамках «ТэАрта». Мы звярнуліся да Аляксандра Марчанкі з Цэнтра беларускай драматургіі і папрасілі падрыхтаваць сваю праграму: у іх праводзяцца драматургічныя лабараторыі і ёсць канкрэтны вынік гэтай працы. Звярнуліся да Беларускай акадэміі мастацтваў, і тыя спектаклі, якія звычайна з'яўляюцца фактам студэнцкага жыцця, увайшлі ў нашу праграму. Ёсць Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Наша праграма дастаткова рэпрэзентатыўная.

Але тэта праграма яшчэ і актыўная. Не проста прыйсці паглядзець, а ўключацца ў размовы, спрэчкі, вучыцца глядзець, разумець і ствараць тэатр. Таму што ў рамках форуму шмат майстар-класаў, сустрэч, сёлета яшчэ дадаецца і адукацыйны праект. І цудоўна тое, што гэта некаму патрэбна, што таксама здаецца дзіўным для Беларусі: тэатр жа наогул не тое мастацтва, якое можа прынесці дывідэнды ў бізнесе. І гэта яшчэ адна асаблівасць гэтага форуму: кожны з партнёраў, якія яго ладзяць, ведаюць, навошта гэта робяць.

— Можна пражыць цудоўна на бульбе і сале. Так елі, не паміралі ад гэтага, жылі. Але ёсць яшчэ бананы, ананасы. Яны могуць падабацца ці не. Але пакаштаваць іх вельмі цікава, — разважае **Віктар БАБАРЫКА, старшыня праўлення «Белгазпрамбанка»**. — Дык давайце пакаштуем нешта іншае, каб ацаніць смак сваёй роднай ежы. Так жа і з мастацтвам. Мы пакаштавалі нечага іншага — і захацелася звярнуцца да свайго, зрабіць яго больш разнастайным. У чым прынцыповая праца нас як партнёраў (нам ад пачатку хацелася бачыць сябе не спонсарамі, а менавіта партнёрамі): мы не фінансуем канкрэтныя пастаноўкі, мы імкнёмся фінансаваць пабудову сістэмы, у якую ўпісаны тэатр, які развіваецца па-за рамкамі дзяржаўных структур. І вось канкрэтныя вынікі: пашырэнне беларускай праграмы, чаму мы шчыра рады. Таму што ў гэтым праекце мэта — выйсці з ізаляцыі інтэлектуальнай прасторы і задаволенасці тым, што мы адно аднаго хвалім і кажам, як усё добра. Давайце спытаем некага іншага: а беларускі тэатр па-за Беларуссю камусьці падабаецца? Каб адказаць на гэтае пытанне, робіцца яшчэ адзін цудоўны крок: запрошаныя госці, якія будуць глядзець беларускую праграму. Паглядзець на сябе чужымі, іншымі вачыма таксама вельмі важна дзеля развіцця.

І гэта ўсё пра тэатр. Пра яго разважаюць важныя, разумныя людзі, якія адчулі яго сілу. І якія разумеюць: мастацтва — люстэрка, у якім адбіваецца жыццё грамадства. Люстэрка, у якім прасцей заўважыць недасканаласці вобразу, яно дазваляе зразумець, што скарэктаваць ці наогул варта змяніць імідж, каб адбітак у люстэрку спадабаўся. Тэатр для мяне — магчымасць паглядзець на сябе збоку. І я з таго самага першага спектакля, які мяне так узрушыў на першым курсе, шукаю пастаноўкі, якія пра мяне і пра нас. Я іх шукаю ў беларускіх тэатрах. І не без поспеху...

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Практыкум

ВЫТКАНА З ЛЮБОЎЮ

У музеі ў Раўбічах навучаць ткаць паясы

Старажытную тэхніку ткацтва на дошчачках прапануе асвоіць 20 верасня манашка Васа. Цудоўны чалавек і мастак, шчырая падзвіжніца фактычна аднавіла даўняе рамяство ткацтва на дошчачках.

Мастак заўсёды застаецца мастаком, незалежна ад таго, куды яго прывёў лёс. А можа, гэта і ёсць лёс у дзеянні: калі ты разумееш, што не проста жывеш, а служыш. У тым ліку і мастацтву. Манашка Васа служыць Богу. Але яна служыць і людзям, і мастацтву. У мінулым мастацтвазнаўца Вера Селівончык, яна вучылася ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, займалася даследаваннямі ткацтва і вышыўкі беларускага Падняпроўя пад кіраўніцтвам прафесара Міхася Раманюка, а потым працавала ў славутай «Скарбніцы». Вядома, такі досвед не мог быць забыты зусім і адкінуты пасля таго, як у 2002 годзе яна прыняла манаскі пострыг з імем Васа.

І ўжо ў сваім новым служэнні яна працягвае несці мастацтва і рупліва адкопвае ў нетрах гісторыі забытыя мастацкія практыкі — рэканструюваць тэхніку пляцення на квадратных дошчачках з дзвюма запраўленымі ніткамі яна здолела ў 2013 годзе. А цяпер гэтаму можа навучыцца кожны падчас майстар-класа ў Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах, у рамках выставы «Самабытныя вобразы сучаснасці».

Мастачка прадэманструе, што адна з самых старажытных тэхнік ткацтва, якою шмат стагоддзяў (нават тысячагоддзяў) карысталіся нашы продкі, можа паспяхова выкарыстоўвацца і цяпер кожнай гаспадыняй дома. З дапамогай дошчачак можна вырабляць паясы, гальштукі, закладкі, дэкаратыўныя падушкі, торбачкі і нават дэкаратыўныя пано. А каму мала аднаго занятку, то можна набыць фактычна падручнік — «Ткацтва на дошчачках. Практычны дапаможнік», нават падпісаць яго ў аўтаркі. Філіял Нацыянальнага мастацкага музея ў Раўбічах такім чынам далучае да традыцыйнага беларускага мастацтва і адначасова прапануе, як правесці выхадны дзень з карысцю і з кубачкам гарбаты. Акцыя выдатная, кошт дэмакратычны (60 тысяч беларускіх рублёў), асабліва, калі ўзяць пад увагу, што гэтаму больш няма дзе павучыцца...

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Па-за сцэнай

КАБ КАСЦЮМЧЫК СЯДЗЕЎ...

Як выглядала мадам Батэрфляй у 1958 годзе?

Яшчэ Станіслаўскі казаў, што тэатр пачынаецца з вешалкі. А ці задумваліся вы над тым, што будні артыстаў Вялікага тэатра пачынаюцца з касцюмаў? Бясконцыя прымеркі і рэпетыцыі. Некаторыя з салістаў балета прызнаюцца, што ў касцюмах рэпетыцыі праходзяць лягчэй. Яны дапамагаюць вельмі яскрава ўявіць сабе вобраз персанажа, якога трэба сыграць. Але, седзячы ў зале, наогул не задумваешся, як касцюмы ствараюцца.

У невялікіх памяшканнях, схаваных ад вачэй гледачоў, нараджаецца прыгажосць. Размовы амаль не чуваць, толькі максімальная сканцэнтраванасць і гукі швейнай машыны, якія парушаюць цішыню. Вакол раскіданы папяровыя эскізы, якія ўжо праз некалькі дзён стануць прыгожай сукенкай альбо сурдутам.

Касцюмы тэатра оперы і балета Беларусі сталі яго своеасаблівай «разынкай». Усе дзівяцца і захапляюцца імі як на сцэне, так і ў фае, дзе яны выстаўлены — нездарма на іх фоне так любяць фатаграфавацца людзі.

Тым больш што такую прыгажосць апраналі на сябе многія вядомыя артысты. Першай і славутай опернай «зоркай» Беларусі стала народная артыстка Савецкага Саюза, першая беларуская Кармэн — Ларыса Александроўская. Яе касцюмы на працягу доўгага часу знаходзіліся ў касцюмернай тэатра. На жаль, да сённяшніх дзён яны не дажылі. Тым не менш сёння тэатр захоўвае сапраўды ўнікальныя экзэмпляры.

Фотаздымкі Дар'і БУРАКІНАЙ

У касцюмерным цэху Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь знаходзіцца больш за 25 тысяч касцюмаў. А калі палічыць усё разам — з абуткам, галаўнымі ўборамі і накідкамі, — то смела можна памнажаць на тры. Гэтая лічба ўключае ў сябе касцюмы да пастановак, якія некалі ішлі ў тэатры і якія ідуць па сёння. Бясконцыя кругавыя калідоры, у якіх толькі па надпісах можна адрозніць касцюмы артыстаў балета ад оперных, захоўваюць у сабе мноства таямніц. Ніводзін швейны цэх не можа паўтарыць сцэнічныя строі, якія пашылі ў тэатры. Тут знаходзяцца строі, якія шылі для балетаў 80-х гадоў. Яны ў выдатным стане. Усе развешаны не ў алфавітным парадку, а ў залежнасці ад іх прызначэння: харавыя, сольныя і г.д. Новым работнікам спатрэбіцца як мінімум два гады, каб перастаць блытацца ў іх.

Касцюмы захоўваюць, не падтрымліваючы спецыяльных тэмпературных. Ёсць сярод іх строі, якія нельга мыць з-за асаблівасцяў тканін і колькасці камянёў. Іх аддаюць у хімчыстку. Не так даўно ў оперным тэатры шылі касцюмы, якія ўручную размалёўвалі рознымі фарбамі. Іх таксама нельга было мыць. Іх чысцілі з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў.

Аднаўляюць адзенне па меры зношвання. Але цалкам спектаклі, касцюм у касцюм, немагчыма аднавіць. Калі адзенне моцна знасілася, яго перадаюць у харэаграфічны каледж ці інстытут культуры. У арэнду іх не даюць. А вось абутак заказваюць на адным з камбінатаў Мінска. У тэатры сёння няма свайго цэха па яго пашыве. Іншая гісторыя з пуантамі — у балерын яны амерыканскія.

Людміла ХІТРОВА (балерына Вялікага тэатра Беларусі) расказала:

— У некаторых балерын ёсць па дзесяць пар пуантаў: да кожнага спектакля свая. Калі казаць пра мяне, то я маю толькі адну пару — не люблю разношваць. Магу яе насіць некалькі месяцаў. Але ж у тэатры раз на тры месяцы кожнай балерыне выдаюць новую пару. Для розных спектакляў патрэбны пуанты рознага колеру, таму я іх сама расфарбоўваю, а потым мыю. Захоўваю іх проста: пасля спектакля прасушваю, потым мыю ў пральнай машыне альбо ўручную і складваю ў спецыяльныя асобныя пакеты, якія прапускаюць паветра.

А вось балетныя пачкі захоўваюць інакш, чым астатнія касцюмы. Іх складаюць адна на адну. Развешваць іх нельга — можа зламацца абруч! Менавіта ў балетах выкарыстоўваецца найбольшая колькасць убораў.

Адным з самых складаных касцюмаў, які давялося шыць і на які быў затрачаны 51 метр тканіны — іспанская сукенка да спектакля «Лебядзінае возера». **Ларыса Філімонаўна МЕЛЬНІК** успамінае:

— Шылі гэты ўбор мы салістцы балета Раісе Красоўскай, цяпер яна ўжо на пенсіі. Артыстка хацела, каб уся спадніца зверху данізу была ў маленькіх рушах. Прыйшлося шыць. Спадніца атрымалася вялікая, пышная.

У оперы самымі складанымі па касцюмах з'яўляюцца гістарычныя пастаноўкі. Але акрамя складанасці пашыву, гэтыя касцюмы яшчэ і вельмі цяжкія. Напрыклад, у операх «Барыс Гадуноў» і «Хаваншчына».

Барытона Вялікага тэатра **Станіслава ТРЫФАНАВА** вельмі часта можна ўбачыць на сцэне ў вобразе гістарычнага персанажа. Артыст прызнаўся:

— Калі такі касцюм апранаеш, усё змяняецца: і голас, і хада. Касцюм павінен добра сядзець, у ім неабходна адчуваць сябе камфортна. Не менш важны момант — якасць тканіны! Бо на сцэне вельмі горача.

Наталля ХАРАБРОВА — начальнік пашывачнага цэха Вялікага тэатра оперы і балета расказала, што ў іх можна знайсці касцюмы з мінулага стагоддзя:

— Зараз у тэатры захоўваюцца касцюмы 1958 года, з оперы «Мадам Батэрфляй» Пучыні. Але касцюмаў да спектакляў столькі, што трэба мець сапраўдную вытрымку, каб паспяваць пераапранаць артыстаў.

Гледачы ідуць у тэатр оперы і балета, каб паслухаць спевы вядомых артыстаў ці паглядзець, як танцуюць салісты балета. І, безумоўна, ацаніць спектакль ва ўсёй яго прыгажосці, у тым ліку і касцюмы. Гэта на Захадзе нават у тэатрах оперы і балета практыкуюць мінімалізм на сцэне і ў касцюмах. Наш тэатр больш традыцыйны, і касцюмы — адзін з яркіх складнікаў, які дазваляе гледачу адчуць, што прыход у тэатр — гэта свята. Касцюмы да спектакляў — гэта і частка тэатральнай гісторыі, якая, магчыма, неўзабаве праявіцца ў выглядзе своеасаблівага музея пры тэатры.

Іна КОРСАК

ТРЫ КІНАПАДЗЕІ, НА ЯКІЯ ВАРТА ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ

Ёсць нагода сказаць, што вялікі экран нас песціць. На ім ужо можна ўбачыць велічную ісландскую прыроду ў карціне сумеснай вытворчасці Ісландыі, Германіі і Нарвегіі «Пра коней і людзей». У прамым сэнсе пра коней і людзей, пра іх трапяткія адносіны паміж сабой і пра тое асаблівае месца, якое гэтыя жывёлы займаюць у культуры і душы ісландцаў.

Карціна Бенедыкта Эрлінгсана ўжо атрымала столькі ўзнагарод, што пералічваць непрыстойна, ды і стомішся. Пяць гісторый з гумарам і рамантыкай будуць разгортвацца ў ісландскім пасёлку да 28 верасня ў кінатэатры «Ракета».

Акрамя таго, пара візуалізаваць (ці зрабіць гэта паўторна) фільмы класіка, гіганта, легенды кінематографа і сюррэалізму Луіса Бунюэля з 24 па 28 верасня. Ад карцін «Андалузскі сабака» і «Залаты век», якія дзівяць уяўленне і нервы, — да шматпланавых, неадназначных фільмаў «Дзённая прыгажуня» (з сапраўды непараўнальнай Катрын Дэнёў) і «Сціплае абаянне буржуазіі».

Рэжысёры з Ісландыі, Іспаніі і... Польшчы. Кінатэатр «Перамога» пакажа рэтраспектыву паляка Ежы Штура. Ён больш вядомы як выдатны акцёр, ды і спіс фільмаў з яго ігрой будзе шырэйшым. Але аднойчы кінаакцёра пацягнула на месца з іншага боку камеры і з рупарам у руках. Тады ён дэбютаваў фільмам «Спіс палюбоўніц», які таксама будзе паказаны ў рэтраспектыве. Можна ўбачыць не толькі рэжысёрскія працы Штура, але і фільмы з яго харызматычным тварам на экране: «Тыдзень з жыцця мужчыны», «Надвор'е на заўтра», «Спакой» Кшыштафа Кеслёўскага, дакументальную стужку «Маё жыццё ў мастацтве» Міраславы Юркоўскай. Глядзім з 22 па 26 верасня.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

■ На свае вочы

СРОДАК ДЛЯ СЭРЦА,

або Таямніца грузінскай гасціннасці

Грузію з вінным турам можна наведваць круглы год. Але лепшы час для гэтага — другая палова верасня — першая палова кастрычніка. Менавіта на «аксамітавы сезон» тут прыпадае ртвелі — збор вінаграду і аднайменнае свята, звязанае з ім. Дарэчы, сёлета ў Грузіі чакаецца добры ўраджай бурштынавых ягад.

КАЎКАЗСКІЯ «ДАЖЫНКІ»

Па сваёй сутнасці ртвелі падобна да нашых дажынак, магчыма, з тым толькі адрозненнем, што ўдзельнічае ў ім практычна кожны грузін. Гараджане едуць на свае дачы, дзеці — да бацькоў, вялікія сем'і збіраюцца разам, астатніх запрашаюць у якасці гасцей.

У Грузіі віно не п'юць,
каб ап'янець. Яго п'юць,
каб пачуць адзін аднаго.
Зразумець і палюбіць.

Свята выліваецца на гарадскія і сельскія вуліцы, захоплівае нават маленькіх дзяцей, якім у гэтыя дні вараць чурчхелу — традыцыйны ласунак з вінаграднага соку (ткбілі) і маладых грэцкіх арэхаў. Палавінкі арэха нанізваюць на нітку і некалькі разоў акунаюць у татару — масу з салодкага соку і пшанічнай мукі, якая варыцца на адкрытым агні. Потым нітку з арэхамі, пакрытымі некалькімі слаямі татары, сушаць на сонцы. Дарэчы, у старадаўнія часы чурчхелу грузінскія воіны бралі з сабой у ваенныя паходы: яе зручна перавозіць, яна не псуецца і добра аднаўляе энергію.

Статус вінаграднай лазы ў Грузіі падобны таму, які ў нас мае хлеб. Тут апроч Міністэрства сельскай гаспадаркі нават маецца Нацыянальнае агенцтва віна, якое клапоціцца, каб у свеце ведалі і куплялі грузінскае віно, а ў самой Грузіі захаваліся мясцовыя традыцыі вырабу гэтага напою, павялічвалася колькасць уласных гатункаў вінаграду, а таксама, каб вінаградарскі і вінаробчы сектар турызму развіваўся.

«ПРАПІТАЯ» ЧАРГА

Ёсць легенда, якую нам расказала **гід з Тбілісі Кетэван ЦЕРЦВАДЗЭ**, пра тое, як грузіны «прапілі» раздачу Богам зямлі. Яны спазніліся, калі Гасподзь раздаваў мясцовасці народам, і калі, нарэшце, прыйшлі, нічога не засталося. Бог спытаў, чаму яны завіталі так позна, і грузіны прызналіся, што пілі віно. «За што вы пілі?» — пацікавіўся Творца. «За здароўе Бога,» — адказалі грузіны. Тады Гасподзь аддаў ім зямлю, якую пакінуў для Сябе, — самую прыгожую. Вось чаму грузіны называюць свой край Зямлёй Бога.

— Калі мы праводзім апытанні сярод турыстаў, то яны кажуць, што першае, для чаго яны едуць сюды — прырода, а другое — кухня і віно, — кажа **кіраўнік Нацыянальнай адміністрацыі турызму Грузіі Гіёргі СІГУА.** — Мы заслужана ганарымся тым, што на нашай зямлі віно рабілі яшчэ 8 тысяч гадоў таму. Тут расце больш за 500 сартоў вінограду.

Але не гэта галоўнае. Віно для грузінаў — не проста напой, а вінаград — не проста ягада. І вінаград, і віно — гэта частка грузінскай нацыянальнай культуры, традыцыі і нават рэлігіі.

Галоўнае ў Грузіі — безумоўна, не віно, а людзі. Побач з аўтарам — Рэвазі Оніані, кіраўнік кутаісцкага царкоўнага хору «Квалі Натэлі».

«Асэнсаванне вінаграднай лазы як «дрэва жыцця» і сімвала вечнасці ў якасці эпітэта звязана з Божай Маці, — тлумачаць аўтары буклета «Вінны турызм» Дэпартамента турызму і курортаў Аджарыі. — Лаза нараджае віно, а віно — гэта сакральная вадкасць, у якую ператварылася кроў Збаўцы. Багародзіца ж — гэта маці Збаўцы, якая прыносіць вечнае жыццё чалавецтву. Усё гэта стварае пэўную містычную аснову, развітую ў каноне «Шен хар венахі» («Ты лаза мая») — самым старажытным гімне вінаграднай лазе».

Згодна з паданнем, першы крыж, які з'явіўся ў Грузіі (а ў 337 годзе хрысціянства тут стала дзяржаўнай рэлігіяй — на 6,5 стагоддзяў раней, чым у Кіеўскай Русі)), быў сплецены самой Божай Маці з вінаградных лоз і перададзены святой Ніне для дабравесця ў гэтым краі. Віно і духоўнасць — рэчы для грузін непадзельныя. Напэўна, гэтым тлумачыцца, што вінныя туры ў гэтую краіну арганічна спалучаюць экскурсіі на вінныя заводы з наведваннем старажытных храмаў. Храмаў у праграмах такіх тураў бывае нават больш. Падазраю, што гэта дапамагае змяніць стаўленне турыста да віна.

РОЛЯ БУРБАЛАК

— Самае галоўнае — віно нельга піць як ваду, — тлумачыць гасцям **менеджар віннага склепа «Слёзы фазана» (Pheasant's Tears) у кахецінскім гарадку Сігнахі Тамара РАКАШВІЛІ.** — Калі вы каштуеце шакалад, вы ж не кусаеце яго вялікімі кавалкамі і не глытаеце адразу, а адкусваеце патрошку і трымаеце ў роце, пакуль ён не растане. Падобным чынам трэба ўжываць і віно.

Тамара вучыць: трэба заўсёды трымаць келіх за ножку, круціць яго, каб адбыўся кантакт віна з паветрам і адкрыліся ўсё адценні смаку. Добрае віно сцякае па сценках посуду ў выглядзе дарожак — «плача». Потым трэба ўдыхнуць водар напою, а пасля набраць невялікую яго колькасць у рот, прапускаючы праз вусны і зубы паветра, каб яно змяшалася з вадкасцю, незаўважна «пабулькатаць» у роце — гэта таксама дазволіць больш ярка адчуць смак. Каб віно ўспрынялі ўсе смакавыя рэцэптары, трэба патрымаць яго ў роце, перш чым праглынуць. Да віна трэба прыслухацца. І да сябе. Да свайго суразмоўцы. Віно — гэта сродак зносін. Выказванне настрою. І пачуццяў. У Грузіі віно не п'юць, каб ап'янець. Яго п'юць, каб пачуць адзін аднаго. Зразумець і палюбіць.

Тут яго даюць нават маленькім дзецям, бо лічаць карысным для здароўя. Пры гэтым, праўда, сочаць, каб дзіця не выпіла больш за сваю норму.

НАПОЙ ДЛЯ ПРЫЗНАННЯ

— Учора ў Тбілісі на вячэру вам, напэўна, падавалі ркацітэлі, — заўважае Тамара, абыходзячы стол з бутэлькай бурштынавага віна. — Гэта — таксама ркацітэлі, ураджаю 2011 года, з лазы, узрост якой 25 гадоў. Пакаштуйце, гэта зусім іншае віно.

У Кахеціі, усходнім рэгіёне Грузіі, сухое белае віно, у адрозненне ад еўрапейскіх вытворцаў, настойваюць на вінаграднай скурцы, з-за гэтага яно мае насычаны бурштынавы колер і непаўторны водар. Спецыялісты называюць смак такіх він шчыльным, насычаным і церпкім, але пры гэтым — незвычайна свежым. Яны пакідаюць асаблівае адчуванне на паднябенні. Лічыцца, што такія белыя кахецінскія віны можна падаваць да любых страў — ад халодных закусак да гарачых мясных страў. Больш за тое, грузінская кухня не будзе поўнай без суправаджэння гэтым напоем.

У Сігнахі я даведалася, што смак віна залежыць не толькі ад колькасці сонца на працягу года, тэмпературы паветра, саставу глебы і таго, як яно выраблена, але і ад узросту лазы. Чым яна старэйшая, тым менш ураджаю дае, але тым мацнейшыя і глыбейшыя яе карані і тым больш багаты смак маюць яе плады.

Старая лаза ў гэтым краі — рэдкасць, бо ў савецкія часы ў пагоні за ўраджаем вінаградныя плантацыі рэгулярна абнаўляліся. Аднак у вінным склепе «Слёзы фазана» ёсць магчымасць прадэгуставаць і набыць віно з 60-гадовай лазы гатунку мцване, якая расце ў высакагорным пасёлку Манаві. І хоць на сайце кампаніі на англійскай мове напісана, які водар і смак мае гэта віно, з якой ежай яго лепш спажываць, Тамара сцвярджае, што кожны павінен сам вучыцца расказваць пра характар віна, і нельга ў гэтым перашкаджаць падказкамі, інакш не будзе развіцця. Не ведаю дакладна, якое развіццё мела на ўвазе Тамара, але сэнс яна ўкладала самы высокі. Так кажуць пра развіццё вобразнага ўяўлення ў дзяцей пры самастойным прачытванні імі кніг.

Што тычыцца закускі — гэта, увогуле, не галоўнае. Галоўнае — нагода, з якой віно п'ецца. Тым не менш кухня ў Грузіі вельмі разнастайная і смачная. Яна вартая асобнай размовы. А тады я купіла бутэльку манаўскага мцване, каб выпіць яго з мужам на гадавіну нашага вяселля.

АДРАДЖЭННЕ КВЕЎРЫ

Кахеція вядомая таксама сваёй унікальнай тэхналогіяй ферментацыі і захоўвання віна — у квеўры — вялізных гліняных збанах у форме конуса, падобных да амфары без ручак. Ад памеру квеўры залежыць тэмпература, пры якой віно зброджваецца. Аптымальныя для гэтага 20-25 градусаў падтрымліваюцца ў 1000-1500 літровых ёмістасцях. У квеўры паменш — ад 50 да 300 літраў — захоўваюць ужо гатовае віно.

Перад тым, як выкарыстоўваць квеўры, яго абпальваюць і абмазваюць знутры воскам, пры гэтым гліна ўсё роўна прапускае паветра — дыхае. Ёсць меркаванне, што пры зброджванні сусла пры пастаяннай халаднаватай тэмпературы квеўры, закапанай у зямлю, лепш захоўваецца водар вінаграду, чым пры выкарыстанні драўляных бочак. Квеўры ў Грузіі былі адзінымі ёмістасцямі для віна да пачатку XX стагоддзя.

Выява крыжа святой Ніны, сплеценага з вінаграднай лазы, у храме Мцхецкага Джвары (св. Крыжа) VI стагоддзя.

Летась традыцыйнаму грузінскаму метаду вырабу віна ў квеўры — картулі — быў нададзены статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэты спосаб не мае аналагаў у свеце і прызнаны адной з лепшых, натуральных і экалагічна чыстых вінаробчых тэхналогій.

Таварыства па развіцці традыцыйнага грузінскага майстэрства Кселоба Картулі сцвярджае, што да нядаўняга часу ў Грузіі заставалася ўсяго пяць чалавек, якія валодаюць мастацтвам вырабляць квеўры.

«Рэальнасць складаецца ў тым, што няма паслядоўнікаў, хто мог бы захаваць і далей развіваць гэта рамяство, — сказана на сайце арганізацыі. — У Грузіі вялікі недахоп маладых людзей, якія цікавіліся б гэтым мастацтвам. Мы як арганізацыя з'яўляемся ініцыятарамі захавання і далейшага развіцця гэтага сапраўднага скарбу Грузіі. Бо мы ведаем, што са знікненнем квеўры знікне і традыцыйны грузінскі метад вытворчасці віна».

Кахеція лічыцца вінаробчай перлінай Грузіі, але гэта не адзіны рэгіён, дзе можна паспытаць непаўторнае віно. Напрыклад, адным з самых старажытных рэгіёнаў вінаградарства і вінаробства Заходняй Грузіі называюць Аджарыю, дзе верхняя мяжа распаўсюджвання вінаграднікаў дасягае 1200 метраў над узроўнем мора. За славутай паўсалодкай хванчкарой трэба ехаць у высакагорную і маляўнічую Рачу. Сталовымі вінамі лепшых гатункаў вінаграду вядомыя Картлі і Імерэці.

Віно — неад'емная частка Грузіі. Але гэта — толькі адна з яе таямніц. Магчыма, яно — важны сродак, які дапамагае зразумець гэту зямлю і людзей, якія на ёй жывуць. Але мэта — самі людзі. У Грузію варта ехаць для таго, каб набыць новых сяброў. І яшчэ адну любоў у сваім сэрцы. Кажуць, гэта вельмі карысна для сэрца. І ніколі не бывае зашмат.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота аўтара.

Мінск — Тбілісі — Сігнахі — Батумі — Мінск

■



Са старажытнай вежы ў Сігнахі адкрываецца чароўны від на Алазанскую даліну.

Квеўры (на пярэднім плане) і тонэ — грузінскія керамічныя печы для выпечкі хлеба.

■ Меншыя браты

ЧАЛАВЕК І ЖЫВЁЛА:

ці магчыма гарманічна суіснаваць без парушэнняў закону?

«Ці бачылі вы калі-небудзь гаспадара, які б ішоў за сваім сабакам з шуфлікам і мяшэчкам?» — задалася пытаннем загадчыца аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ЖАЎНЯК. На думку спецыяліста, мірнае суіснаванне жывёлы і чалавека залежыць ад нашай культуры.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Да яе ж, пэўна, можна аднесці і той факт, што, на жаль, застаецца распаўсюджанай з'ява бадзяжных жывёл, якіх адлаўліваюць. Аднак, па словах **кансультанта ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Віялеты АНДРЫЯНАВАЙ**, дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву рэспубліканскіх органаў з грамадскімі арганізацыямі дынаміка адлову жывёл і складання пратаколаў аб адміністрацыйнай адказнасці на гаспадароў пайшла на спад.

«Калі за апошнія пяць гадоў праглядалася каля 80 тысяч адлоўленых жывёл, то летась гэтая лічба склала каля 60 тысяч», — дадала кансультант.

Правіламі ўтрымання жывёл прадугледжана, што ў кватэрах можна трымаць не больш за дзве жывёлы (маюцца на ўвазе жывёлы-кампаньёны — кошкі і сабакі). Гадаванцаў (як сабак, так і кошак) неабходна своечасова рэгістраваць. Існуюць таксама правілы выгулу, паводле якіх жывёла павінна знаходзіцца на павадку, у намордніку, а гаспадары мусяць прыбіраць за сваімі ўлюбёнцамі.

Паводле тых жа правілаў, выгульваць сабак нельга ў дварах, на дзіцячых пляцоўках, каля школ і садкоў... У той жа час, як вызначылі спецыялісты, выгул жывёлы пачынаецца тады, калі сабака выходзіць за межы кватэры, дзе ўтрымліваецца. І каб дайсці да спецыяльнай пляцоўкі, ён усё ж мусіць перасячы той жа пад'езд, двор, вуліцу... Ці робіць гэта аўтаматычна гаспадара парушальнікам правілаў? Не робіць, супакоілі спецыялісты, дадаўшы, што ніхто вас не будзе затрымліваць, калі вы ідзяце з сабакам па двары. Аднак спецыяльных месцаў для выгулу сабак у горадзе катастрафічна мала.

«Пляцоўкі вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Але пры забудове, якая ўжо існуе, напрыклад, у Мінску ці абласных цэнтрах, не ўяўляецца магчымым іх абсталяваць, хіба што яны будуць прадугледжаны ў праектах новых будоўляў», — сказала Віялета Андрыянава.

Па словах Ірыны Жаўняк, сітуацыя з пахаваннем хатніх гадаванцаў таксама застаецца неўрэгуляванай. Хаваць сваіх жывёл у дварах, парках, скверах нельга, бо, апроч маральна-этычнага аспекту, тут можа з'явіцца і санітарны — у выглядзе таксічнай небяспекі. Дзе ж хаваць любімых гадаванцаў, калі спецыялізаваных могілак, як, напрыклад, за мяжой, у нас няма? На платнай аснове паслугі па пахаванні жывёл могуць аказваць на жывёльных могільніках. Але гэта часцей за ўсё біятэрмічнае пахаванне — не кожны гаспадар зможа пагадзіцца на такое. Таму людзі нярэдка самі арганізуюць пахаванні і гэтым аўтаматычна парушаюць правілы...

Падобныя пытанні мог бы ўрэгуляваць закон аб абыходжанні з жывёламі, але ўжо некалькі гадоў не ўдаецца яго прыняць — застаецца шмат спрэчных момантаў. Па словах спецыялістаў, галоўная складанасць у тым, як спалучыць у законе правы чалавека з правамі жывёлы, не парушыўшы ні адны, ні другія.

Пакуль жа гаспадарам застаецца кіравацца правіламі, парушэнне якіх, дарэчы, караецца даволі жорстка — папярэджаннем або накладаннем штрафу ад 1 да 15 базавых велічынь. А калі пры гэтым нанесена шкода здароўю людзей ці маёмасці, то гаспадару можа пагражаць штраф ад 10 да 30 базавых ці нават адміністрацыйны арышт.

«Летась было складзена каля 700 пратаколаў за парушэнне правілаў утрымання жывёл», — паведаміла Віялета Андрыянава.

Апроч таго, штогод рэгіструюцца выпадкі нападу жывёл на людзей. Укус незнаёмага сабакі можа быць небяспечны шаленствам, таму, калі ён здарыўся, неадкладна трэба звярнуцца ў паліклініку. Як паведаміў **урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ**, на год здараюцца 1—2 выпадкі захворвання на шаленства. Сёлета пакуль што такіх выпадкаў не зарэгістравана.

Каб не ствараць небяспеку для сябе, сваіх гадаванцаў і навакольных, жывёл трэба штогод прышчапляць і рэгулярна паказваць ветэрынару. А яшчэ гаспадарам варта памятаць пра тое, што любую жывёліну трэба выхоўваць.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

КАЛІ ТОПІШСЯ...

Не сакрэт: тое, што вырасціў сам, на сваім гародзе, заўсёды лепшае і смачнейшае за тое, што можна набыць у краме. Памідор узяць альбо агурок, — сарваны са сваёй ляхі ён сакавіты, пахкі, ён свой!

А мяса? А малачко? Ды не параўнаць жа!

Мусіць, таму многія з нашых местачкоўцаў нават не могучы, з апошніх сіл, стараюцца трымаць кароўку, козачку, гадаваць свіней.

Занятак гэта, вядома ж, не танны. Але, гульня, кажуць, вартая свечак.

Дык вось. Адны мае знаёмцы вясной прыдбалі парсючка — да Каляд сваёй свежыны хацелі. Справа гэта добрая — сваім вынікам. А вось працэсам...

Еў парсючок, што называецца, за вушы не адцягнеш. І ўсё, што дадуць.

Спачатку яму, невялічкаму, і давалі па сем разоў на дні рознай смакаты: бульбы з зімы засталося, трохі буракоў, камбікорму купілі... Але ж праз месяц-другі ад гэтых запасаў амаль нічога не засталося — усё гадаванец падмёў!

Гаспадар з гаспадыняй давай разважаць, што ж далей рабіць? І закалоць свінчо як быццам бы рана, і карміць няма чым.

...Не буду сцвярджаць, што парсючок гэтыя размовы пачуў. Скажу, што дакладна ведаю: неяк пад абед пайшла гаспадыня ў хлеў, каб пакарміць свайго гадаванца, і ледзьве не самлела: дзверы там насцеж, загарадка зламаная, а парсючка і след прастыў...

Па мабільным звязалася з мужам, напалохала беднага. Той спачатку падумаў, што нехта памёр — гэткі ў жонкі голас быў... Але ж і сам занерваваўся: шкада стала — прычым не толькі патрачаных сіл ды грошай... Прывык ён да парсючка, столькі надзей з ім звязваў. Адпрасіўся з працы, кінуўся шукаць.

Спачатку разам з жонкай, што называецца, узялі след: на вуліцы без асфальту гэта вельмі проста было. А далей куды? Апытанне прахожых выніку не прынесла...

Прынёс — тэлефонны званок: прыяцель, які праходзіў ля будынка Аграпрамбанка, згледзеў там свінчо. Папытаўся: «Гэта выпадкам не ваша? На тэрыторыю рвецца, агароджу падрывае...»

Пашчасціла яшчэ, што захапіўшыся, ушчаміўся той бедны парсючок між сталёвых прутоў... А тут і гаспадар з гаспадыняй: за заднія ножкі яго — і дадому.

Па дарозе нарадавацца не маглі, нацешыцца: «Бач ты, які малайчына! Самі не даўмеліся, дык ён падказаў, што закалоць ніколі не позна, а спачатку ж крэдыт можна ўзяць!.. І ведаў жа, дзе!»

А зрэшты, той, хто топіцца, і за трэску хопіцца. Ці не так?

Аляксандр Матошка,
г.п. Расоны

САБАКА БРЭША...

Гэта было на суседскіх дачах. Адна з жанчын там дужа любіла плёткі па хатах разносіць. Ну напрыклад: ці не кожнаму стрэчнаму «па сакрэце» даказвала, што Ягоравіч не па сродках жыве (усе імёны зменены. — **Аўт.**), не па сродках і лазню будуе — не іначай як хабар бярэ; што Сяргеевіч («гэта ж сорам які — жанаты чалавек!») да Сямёнаўны на тэлевізар ходзіць і глядзіць яго аж да раніцы; што Варвара Віктараўна («а ў гэтай даўно сумлення няма!») з суседам у лес зачасціла — як быццам у грыбы, а насамрэч...

Як ні дзіўна, плёткі гэтыя людзі слухалі, а многія дык нават і верылі. Можа, таму што «разносіла» іх Алена Пятроўна, якая да выхаду на пенсію працавала сакратаркай у досыць высокага начальніка, а можа, таму, што кожны раз яна шчыра хрысцілася-бажылася, кожны раз прыгаворвала: «Каб мне з гэтага месца не сысці! На ўласныя вочы бачыла! А ў наступны раз і вам пакажу!».

Аднойчы і сапраўды — «паказала».

...У той спякотны жнівеньскі дзень панёс яе чорт паўз дом Ірыны Міхайлаўны. Траву ў той час ніхто не касіў, музыку не слухаў, таму з-за плоту і досыць выразна данеслася гаспадыніна:

— Віця, ну чаго нам баяцца? Ды кінь ты... Ну давай паспрабуем...

Алена Пятроўна стала як укапаная (бліжэй да агароджы... Быццам басаножак паправіць), бо Віця — гэта ж здаецца, зяць?

Так і ёсць!

І ў адказ ён кажа:

— Ды не магу я, мама! Не буду!

Алена Пятроўна вокам прыпала да дзіркі ў плоце. Божухна, за ім — карціна алеем, можна сказаць: гаспадыня з аголеным нізам — жыватом, нагамі — расселася, нават не, разляглася на лаўцы, а зяць (з адзежы, як і на ёй, толькі нейкія плаўкі) топчацца паблізуды ўсё марыча сваё: «Не магу я, не буду».

Ага, значыць, жонка яго, — разважала Алена Пятроўна, — з'ехала ў Мінск. А цешча... Ну ты паглядзі! Хоць яна і ўдава, але ж сорам які — спакушаць свайго зяця. Той («людцы добрыя, ну што ж гэта робіцца?!») ужо нахіліўся над ёй...

Алена Пятроўна куляй паляцела склікаць суседак!

У маліннік, што рос каля агароджы, месца хапіла ўсім, невялічкіх дзірак у плоце — таксама: тры пары цікаўных вачэй сталі ўважліва глядзець, як зяць нешта ж робіць, нахіліўшыся над цешчай... Тры пары вушэй сталі слухаць, як тая ціха войкае, але ж падбадзёрвае: «Віця, я добранька лягла? Ці зручна табе? Ну ты давай, смялей, не бойся. Мне балець не будзе!».

— Во распусніца! Во распусніца! — ледзь не ўголас абурылася Алена Пятроўна.

І амаль у той жа момант з-за плоту пачула:

— Усё, мама! Ёсць, галубок, цэленькі... Мы дасталі яго!

— Дзякуй, Віечка, — загаварыла ў адказ цешча, захінаючы халат. — Я ведала, што ў цябе атрымаецца. А то заладзіў: «Паліклініка ды паліклініка... Хірург...» Як быццам ён сядзіць ды чакае нас. У яго пад дзвярыма цяпер, можа сто чалавек з кляшчамі сядзіць. Цэлы дзень у чарзе змарнавалі б...

Пачуўшы пра кляшчоў, Алена Пятроўна пачырванела, зніякавела... Суседкі дружна засмяяліся, а потым, здаецца, упершыню ў вочы ёй сказалі:

— Ну і мастачка ты на людзей пабрахаць...

Уладзімір Пернікаў,
г. Гомель

ПЕДАГАГІЧНАЯ ПАЭМА

Лета — час адпачынкаў, у нашых дзяцей — таксама.

Дык вось. Гадоў колькі таму, у якасці выхавальніцы, я апынулася ў мясцовым аздараўленчым летніку. І даверылі мне там групу чатырнаццацігадовых балamутаў... Шчыра скажу: спачатку я вельмі старалася — ахрыпла ўжо на другі дзень, бо тыя архараўцы, вырваўшыся на волю, літаральна разносілі атрад. Прасіла іх напрамілы Бог хоць крыху супакоіцца, не бегаць, не крычаць ва ўсё горла... І яны як быццам слухалі, бо спыняліся, згодна ківалі галовамі, але ў наступныя хвіліны вэрхал пачынаўся зноў і з новай сілай.

А таму, страціўшы ўсякую надзею навесці парадак (ці хоць бачнасць яго), я адступіла. Выратавала (хай даруе тагачаснае начальства) проста не замінаць сваім «дзецям» — сачыць толькі за тым, каб яны былі пакормленыя ды здаровыя, каб хоць трохі бралі ўдзел у лагерных мерапрыемствах і каб ноччу хлопцы і дзяўчаты спалі ў сваіх пакоях, а не так, як ім, падлеткам, хацелася...

Пяцікласніка Дзіму прывезлі ў летнік са спазненнем. Знешне — добрае, ціхае дзіцятка... «Хоць з гэтым праблем не будзе», — пацешылася я. Але ўжо назаўтра мае гадаванцы заявілі, што ў атрадзе з'явіўся... злодзей, што ён крадзе часопісы з коміксамі і хавае сабе пад матрац.

Гэтага мне толькі не хапала!

Трэба ісці разбірацца, трэба нешта казаць. А што? Педагагічнага досведу — кот наплакаў, сваіх дзяцей таксама не было. А «злачынца», бачу, стаіць — чакае маіх натацый і апраўдвацца нават не збіраецца.

Можа, па гэтай прычыне голасу я не павысіла: спакойна папрасіла Дзіму, каб аддаў, тое, што ўзяў без дазволу. А далей...

Мусіць, ад няведання, што рабіць і казаць, папрасіла дзіця дапамагчы мне ў сталоўцы — з раздачай абеду.

Вы б пабачылі, як загарэліся вочкі ў малога, як ліха ён потым снаваў ад сталоў да кухні! На ўсю змену зрабіўся маім памочнікам: сачыў, каб перад ядой усе памылі рукі, а перад сном — ногі, склікаў дзяцей на мерапрыемствы, ва ўсім удзельнічаў...

Іншымі словамі, я нарадавацца не магла на гэтага хлопчыка, хваліла яго, прыбірала на дыскатэкі. Бывала, не адзін пакой абыду, але прас адшукаю: не магла дазволіць, каб мой Дзімос ішоў на танцы ў пакамечаных штанах і кашулі.

А дзіця аж скакала ад радасці, бо гэта ж яму (!) сама важатая прасуе адзенне, расказвае (яшчэ і персанальна!), што дзяўчаты любяць акуратных і чыстых кавалераў. Часам (акурат такі!) ён запрашаў мяне танцаваць. Ішла, бо гэта ж няважна, што партнёр на дзве галавы ніжэйшы...

Ці трэба казаць, што пра крадзяжы ў нас нават размоў больш не было! (Думаю, большыя хлопцы проста крыўдзілі Дзіму, вось ён і ўзяў тыя часопісы — ад нейкай помсты ці злосці... Гэта пратэст такі быў. А з'явіліся падставы для гонару — і ўсё стала на месца...)

Такая вось педагагічная паэма — з досыць нечаканай для мяне (па тым часе) высновай, што моўчкі дараваць, не чытаць натацый таксама часам карысна.

...Цяпер той Дзіма ўжо, мабыць, зусім дарослы. Цікава, кім ён стаў? І якім? Ці помніцца яму тая змена ў лагеры?

Вольга Данэйка,
г. Беразіно.

Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР.

Усё пра Еву

■ Парады дамы

МУЖЧЫНЫ ЛЮБЯЦЬ ЭГАІСТАК?..

— А я хачу выгадаваць дачку сцервай, — сказала яна.

І растлумачыла:

— Сцервам жыць лягчэй. Мужчыны любяць эгаістак.

У прыцемках перадвячэрняй пары мяккае святло насценнага бра цёплай плямай разлеглася на маленькім століку, дзе на сурвэтках у прыгожых кубачках астывала кава. Тры суседкі, амаль прыяцелькі, мы не ўпершыню збіраемся — то ў адной, то ў другой, то ў трэцяй — проста так, «на каву».

— Вось на мне ўсё: і кватэра, і дзеці, і гатаванне, і мыццё, і прасаванне, і нарыхтоўкі на зіму, нават рамонт... А што за гэта маю? Ніякай павагі!.. Ат, што і казаць, вы самі добра ведаеце.

...Колькі лішняй працы мы, жанчыны, самі ўзвальваем на сябе. Добраахвотна! І яшчэ ганарымся: вось, маўляў, якая я працавітая!.. А здаровы, дужы муж у гэты час ляжыць на канапе і пальцам не варухне, каб дапамагчы.

Мы ведалі яе мужа — дарослае дзіця, амаль самае бездапаможнае і капрызлівае ў сям'і.

— А гляньце ж... — яна назвала нашу агульную знаёмую, таксама суседку. — Усю кухню на мужа спіхнула, нават мыццё талерак, а сама нафарбуецца і пайшла. А ён яе, кажуць, на руках носіць. Не, мужчыны любяць эгаістак!

— Любяць таго, хто любіць сябе, — ціха прамовіла трэцяя з нас, і я не зразумела: падтрымлівала яна папярэднюю думку ці пярэчыла ёй.

Вось і я згодна з тым, што любяць таго, хто сам сябе любіць, і паважаюць таго, хто сам сябе паважае. Бадай, гэта асноўная выснова, якую я зрабіла для сябе за многія гады сямейнага жыцця. Колькі разоў чула: «Ай-яй-яй, такая яна добрая гаспадыня: і шые, і мые, і смажыць, і вяжа, а ён пайшоў да іншай! Што ім, мужыкам, яшчэ трэба?!.»

А і праўда, што ім трэба? Над некаторымі пытаннямі я задумвалася не раз. Напрыклад, ці трэба жанчыне ўвесь воз хатніх турбот везці на сабе, ці цэняць гэта нашы блізкія ды і наогул ці варта ўсё ўмець? Вось я не ўмею кансерваваць кампоты. Што з мяне возьмеш? Калісьці, дваццацігадовай, мне было страшна падступіцца да гарачых слоікаў з крута завараным сіропам: баялася абварыцца, ды і не магла слабымі рукамі добра прыціснуць накрыўку. А вось мой тады таксама дваццацігадовы муж сваімі дужымі рукамі ўпэўнена і хутка закручваў адзін слоік за другім ды яшчэ смяяўся, якая я палахліўка. Але ж смяецца той, хто смяецца апошнім, праўда?..

Трыццаць пяты год ён гэтыя кампоты круціць. Зараз значна пашырыў сваё майстэрства: вырабляе яблычны сок, марынуе памідоры, агуркі, розныя салаты... Часам думаю, колькі лішняй працы мы, жанчыны, самі ўзвальваем на сябе. Добраахвотна! І яшчэ ганарымся: вось, маўляў, якая я працавітая!.. А здаровы, дужы муж у гэты час ляжыць на канапе і пальцам не варухне, каб дапамагчы. Навошта? Жонка і сама ўправіцца. Праверана часам.

А вы паразважайце, як гэта выгадна — чагосьці не ўмець. Напрыклад, не ўмець рабіць рамонт: маўляў, жанчына — істота пяшчотная, у яе ад фарбаў галава баліць, ды і шпалеры мужу з сынам зручней клеіць. А мыццё бялізны ў машыне? Тэхніка, аўтаматыка, кнопкі — чым не работа для мужчын? Дык не, усё бяром на сябе, крычым: «Ты не так пафарбаваў!.. Ты няроўна шпалеры паклеіў!..» Наш жаночы гонар бярэ верх над жаночай хітрасцю, і мы самі лезем у пастку. Ды і саромеемся нешта не ўмець. А што, маўляў, людзі скажуць: суседкі, сяброўкі, свякроў? А эгаісткі не думаюць, што там хто пра іх скажа. Яны робяць, як ім выгадней, таму ім і лягчэй жыць.

Другую выснову, якую я зрабіла: мужчыны не цэняць нашу жаночую працу так, як бы нам хацелася. Смачна гатаваць, чыста прыбіраць, прыгожа шыць і вязаць, рабіць неверагодныя салаты, гатаваць на зіму смачныя кампоты — усё гэта для іх зусім не ЗАСЛУГА наша, а ўсяго толькі абавязак. Няма ў жонак такіх здольнасцяў — не задаволены, сварацца, кпяць, прымушаюць навучыцца, а ёсць — не заўважаюць.

Ды што ім усё ж трэба? Адна калега скардзілася:

— Мой Юрка нейкі дурны: не дае мне працаваць у нядзелю. Як толькі бяруся прасаваць ці пірог пячы, ён злуецца. Хоча, каб ляжала з ім на канапе ў абдымку і тэлевізар глядзела.

— Дык табе горш? Кідай усё і кладзіся на канапу...

— А я не магу, каб у мяне ў шафе была гара непрасаванай бялізны!..

Гаспадынька, утаймуйся! Тая гара, што ляжыць у шафе, на цябе не пакрыўдзіцца за няўвагу, а вось тая, што ляжыць на канапе... Муж можа пакрыўдзіцца і вырашыць, што ты не хочаш падзяляць яго поглядаў, настрою, што цябе не цікавіць тое, што цікавіць яго, і наогул, што інтэлектуальна ты да яго ўзроўню не дацягваеш. Падсвядома ён ужо будзе гатовы да пошукаў той, якая падтрымае і падзеліць яго погляды.

Трэцяе, што хачу вам сказаць: у кожнага чалавека ёсць нейкія недахопы і схільнасці. Высветліўшы з часам у мужа і тое, і другое, не так ужо цяжка да яго прыстасавацца. Адзін любіць добра паесці, затое не патрабуе ў хаце чысціні, як у аперацыйнай. Іншы ж, наадварот, любіць, каб усё блішчэла, а з дня на дзень можа есці адну макарону са смажаным яйкам. Дык для першага лепш пірог спячы, чым лішні раз за пыласос хапацца, а для другога не гатаваць паўдня прысмакі, а за паўгадзіны да яго прыходу прайсціся мокрай анучай па падлозе — і ўсё о'кей!

«Нельга ахапіць неахопнае», — гаварыў мудры Казьма Пруткоў.

Дык і не трэба! Нам, жанчынам, трэба быць мудрэйшымі, а то і хітрэйшымі. І дачок не эгаісткамі гадаваць, а вучыць іх жаночаму розуму.

Тамара БУНТА

■

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

ІДЗЕ КАЗА РАГАТАЯ...

Я, безумоўна, Казярог, але не ў гэтым сутнасць. Так, упартая, як тры з паловай Казярогі адначасова, і нават магу бадануць рогам, калі справа таго вартая, але не пра тое, зноў жа, размова.

Яе завуць Мара. Яна мяккая, цёплая, далікатная і ўтульная — быццам воблачка. Але не белая, як чысты аркуш, не плямістая, як жыццё, а спрэс шэрая — як маё ўяўленне аб сапраўднасці. Завуць яе, я сказала ўжо, Марай, і яна існуе — пакуль што! — выключна як мара. Вось бывае ж такое: супраць усіх законаў фізікі, логікі і матэматыкі неіснуючае — існуе! І нават мае назву.

Мая Мара — гэта мая мара.

Мара — шэрая каза з крывым рогам. Яна будзе пасвіцца на зялёнай (колер надзеі!) траўцы (у якой будуць сям-там пракідвацца дзьмухаўцы або лубін — не важна), адпачываць у жоўтым хлеўчыку з карычневым чарапічным дахам, пазіраць у акенца з блакітнымі аканіцамі, піць ваду з чырвонага вядзерца і даваць белае-белае малако.

Уся рэч у тым, што я апошнім часам не магу спакойна, без асаблівага яскравых эмоцый пазіраць на коз, якія або пасвяцца, паважна водзячы рожкамі, дзе-небудзь пры дарозе, або суседнічаюць з нашай дачай (такіх ажно тры — чорная, белая і шэранькая), або пазіраюць вачыма гарэзаў з экрана тэлевізара, не ведаючы нават, што пазіраюць на мяне і што я іх таксама бачу. Апошняе — зноў жа, здавалася б, супраць вядомых нашаму свету законаў. Але свет гэты тым і прывабны, што ёсць у яго насельнікаў сякія-такія магчымасці сёе-тое паабвяргаць. Або ўсталяваць нешта новае.

Што прыводзіць мяне да ўпэўненасці, што мая мара спраўдзіцца адназначна і ўсё будзе менавіта так, як я намалявала ў сваіх думках? Закон Жоўтага Кракадзіла.

Ніякіх прыдумак! Закон Жоўтага Кракадзіла існуе! Гэта адзін з самых любімых маіх законаў, якія вывучаюцца навукай пад назвай шчасцезнаўства. Мне абсалютна не важна, што такой навукі няма ў афіцыйным рэестры сусветных навук, галоўнае — што яна ўваходзіць у пералік дысцыплін, якія абавязкова разглядаюцца Вышэйшай Атэстацыйнай Камісіяй Свету. Закон гэты закранае такую важкую катэгорыю, як час, і кароткa фармулюецца наступным чынам: мінулае ўяўляецца, будучыня ўспамінаецца. Аўтарства належыць — я зараз не магу не адчуваць асаблівага гонару за свет, у якім жыву — псіхолагу Нэлі Ксяневіч.

Фармулёўка для падручніка: у дараванай нам бясконцасці з вычарпальнай доляй верагоднасці можа рэалізавацца якая заўгодна думка, падмацаваная моцнымі эмоцыямі. Гэта трэба вывучыць і час ад часу паўтараць. Уголас, гледзячыся ў люстэрка.

Будучыня — успамінаецца. У час, калі я паступала ва ўніверсітэт, у мяне з'явілася новая белая сумка. Я была ёй рада не таму, што яна новая або белая. Я церабіла «маланку», уяўляючы, як буду напаўняць сумку канспектамі. «Ружовы сшытак — «неарганіка», блакітны — фізіка, зялёны — інфарматыка». Можна падумаць, што паступіла, бо надта добра рыхтавалася. Нічога падобнага: з мужам, дзіцем, жыццём у інтэрнаце, праз шэсць гадоў пасля заканчэння школы... Я проста марыла, і ў гэтай сваёй мары ні ў чым ні на кроплю сабе не адмовіла.

Я не ведаю, як і калі мая Мара спраўдзіцца. Проста ўяўляю яе. Як гераіню казкі, дзе ёсць яшчэ дзед, баба і малая ўнучка. Можа, гэта з-за таго, што і я ўжо бабуля? І ў нас з Ім ёсць маленечкая ўнучка — ружовенькі цікаўны камячок...

Мая Мара — спраўдзіцца. Мы з унучкаю яшчэ і новы гатунак сыру вынайдзем, вось пабачыце

■

УМЕЦЬ ЧЫТАЦЬ ПА... ПЯРСЦЁНКАХ

Многім падабаюцца ўпрыгажэнні. Але мала хто ведае, наколькі яны могуць «раскрыць» чалавека, расказаўшы пра некаторыя жаданні, імкненні, страхі. Глядзіце на рукі і рабіце высновы.

ВЯЛІКІ ПАЛЕЦ. Нязвыклае месца для пярсцёнка. Аднак такое яго становішча, хутчэй за ўсё, сведчыць пра жаданне чалавека прыцягнуць да сябе ўвагу, падкрэслівае імкненне да дэманстратыўнасці.

УКАЗАЛЬНЫ. Упрыгажэнне тут паказвае моцную волю і актыўнасць уладальніка або яго імкненне стаць такім чалавекам. Паглядзіце ўважліва на выявы ўладароў — і вы заўважыце, што ў дыктатараў гэты палец амаль заўсёды «падкрэслены» якім-небудзь вычварным вырабам. Будзьце асцярожныя з уладальнікам «пярсцёнка ўсеўладдзя», ён не любіць «другіх роляў» і стараецца даволі хутка адстаяць сваё права на раздачу каштоўных указанняў. Калі гэта мілая ўсмешлівая дзяўчына, ведайце: у цені яна доўга не застанецца.

СЯРЭДНІ. Нездарма займае цэнтральнае становішча на руцэ, бо сімвалізуе пачуццё ўласнай годнасці, самалюбства, а часам і ганарыстасць. Пярсцёнак на гэтым пальцы дэманструе павагу гаспадара да сябе. Важна, што ён патрабуе таго ж і ад іншых. Невялікія, вытанчаныя ўпрыгажэнні нагадваюць, што гэты чалавек ведае сабе цану і хоча, каб да яго ставіліся адпаведна. Вялікія, бліскучыя пярсцёнкі або крычаць аб гордасці, або «сігналізуюць» пра незадаволенае жаданне высокай ацэнкі навакольнымі. Памятайце, статусныя адрозненні для гэтага чалавека маюць значэнне.

БЕЗЫМЕННЫ. Паказвае на ўспрымальнасць чалавека, дэманструе яго пачуцці. Заручальны пярсцёнак тут не выпадкова. Пакуль ён на руцэ, чалавек паказвае важнасць свайго шлюбу. Упрыгажэнне (нешлюбнае) на пальцы ў мужчыны гаворыць пра яго павышаную адчувальнасць (экзальтаванасць, узбуджальнасць), і няхай яго надта брутальны выгляд вас не падманвае. Жанчыны часам па-над заручальным надзяваюць іншы пярсцёнак, звычайна з напаўкаштоўным каменем. Гэта сведчанне значнасці шлюбу для яе, ён узмацняецца і ўмацоўваецца. Ювелірны выраб вялікага памеру паказвае, што нам сустрэлася вельмі экстравагантная асоба. Ну а ўпрыгажэнне на пальцы левай рукі ў нашай культуры нават не «сігналіць», а «семафорыць» пра жаданне гаспадара або гаспадыні памяняць свой матрыманіяльны статус.

МЕЗЕНЕЦ. Нездарма гэты палец «гуляе на бок». Ён сімвалізуе жаданне ўладальніка пярсцёнка адыходзіць ад агульнапрынятых правіл. Прычым як у псіхалагічным, так і ў эратычным плане. Чалавек імкнецца да новых уражанняў і адчуванняў. Калі ўпрыгажэнні традыцыйныя (каштоўныя камяні, апраўленыя ў золата або серабро), то гэта жаданне набыць досвед без асаблівых намаганняў. А вось які-небудзь ювелірны цуд або нейкая мудрагелістая штука на мезенцы — гэта заяўка на адмысловыя і арыгінальныя станы.

УПРЫГАЖЭННЯЎ НЯМА

Людзі не носяць упрыгажэнняў па розных прычынах. Адна з іх — скрытнасць, няўпэўненасць у сабе, жаданне быць непрыкметным. Другая — высокая самаацэнка, яны настолькі ўпэўнены ў сабе, што не маюць патрэбы ў спробах навакольных іх «класіфікаваць». Часам гэта праяўленне пазіцыі: «Няхай мяне ўспрымаюць і ацэньваюць як чалавека справы — толькі па думках і ўчынках».

ПЕРШ ЧЫМ АЦЭНЬВАЦЬ ЧАЛАВЕКА ПА ЯГО ПЯРСЦЁНКАХ, УЛІЧЫЦЕ:

- **кожны палец рукі мае сваё значэнне;**
- **адзін і той жа пярсцёнак на розных пальцах дасылае розныя «сігналы»;**
- **тэст дзейнічае, калі ўпрыгажэнні надзяваліся неўсвядомлена, па прынцыпе «мне так пасуе»;**
- **памер упрыгажэння гаворыць пра важнасць «сігналу»: чым яно большае, тым большае праяўленне прыкметы.**

І галоўнае — гэта толькі тэст, не трэба надаваць яму сакральнага значэння. Як і ўсе тэсты, ён сведчыць толькі пра тэндэнцыі і не бывае на сто працэнтаў аб'ектыўным. І яшчэ: паказваючы камусьці руку, зніміце пярсцёнак з мезенца — раптам чалавек няправільна вас зразумее.

■ Модны гардэробчык

ДАДАЙЦЕ Ў АДЗЕННЕ «ПЯРЧЫНКУ РАШУЧАСЦІ»,

або Што апрануць гэтай восенню?

Футра, карункі, кепі. Спадніцы-гафрэ, сукенкі-футляры і штаны а-ля Марлен Дзітрых. Пра гэтыя ды іншыя модныя тэндэнцыі сезона восень-зіма 2014/2015 нам распавяла мастак-мадэльер беларускага «Цэнтра моды» Вікторыя КОЛБ:

— Для моды гэтага сезона характэрны функцыянальнасць і зручнасць. Але яна не пазбаўлена індывідуальнасці. Таму кожная модніца пры выбары адзення павінна памятаць, што няправільна выбраная вопратка можа сапсаваць не толькі яе воблік, але і настрой. Перш за ўсё адзенне павінна быць камфортным.

Сезону восень-зіма 2014/2015 уласцівы наступныя чатыры тэндэнцыі.

Па-першае, **мужчынскі стыль** у адзенні. Ён застаецца актуальным яшчэ з мінулых сезонаў. Своеасаблівая дзяўчына-дэндзі, апранутая ў жакет і штаны мужчынскага стылю. Такія ансамблі вызначаюцца кансерватыўнасцю. Могуць быць адна- ці двухбортныя, з аксесуарамі ці без. Тэндэнцыя гэта прадыктавана сацыяльным статусам некаторых сучасных жанчын. Яны цяпер самастойныя, незалежныя, самадастатковыя. Зварот да такой вось «мужнасці» дапамагае падкрэсліць пярчынку рашучасці ў іх вобразе.

Па-другое, **колерблокі**. Гэта калі ідзе спалучэнне ў адным ансамблі двух яркіх колераў, што стаяць побач у спектральным кругу.

Па-трэцяе, шырокае выкарыстанне **футра**. Доўга- і кароткаворсавага. У асноўным дызайнеры робяць акцэнт на яркія, насычаныя колеры. Стракацяць футравыя калекцыі на подыумах! Гэта не вельмі функцыянальна для штодзённага жыцця. Але смелыя какеткі могуць дазволіць сабе і такі ўбор.

Па-чацвёртае, спалучэнне ў ансамблі **адценняў аднаго колеру**. Чарнейшае за чорнае, напрыклад. Тут вопратка будзе адрознівацца па фактуры. Ці цалкам бэжавы строй. Нават аксесуары: капелюшы, сумкі, абутак — усё павінна быць у адным колеры.

Сукенкі могуць быць самай рознай даўжыні — міні, мідзі і максі. Максі часцей за ўсё выбіраюць для вечара. А для офіса лепш падыдуць сукенкі-футляры ці іншыя мадэлі не надта прылеглага сілуэту, завужанага ўнізе. Рукаў ушыўны, спушчаны ці цэльнакроены. У любым выпадку сукенку трэба выбіраць на свой густ. Колер тут, дарэчы, мае вялікае значэнне. Увогуле, колер і сілуэт — самае галоўнае пры выбары сукенкі. Калі два гэтыя складнікі падабраны ўдала, вы адшукалі найлепшы варыянт.

Для штодня падыдуць як клятчастыя сукенкі, так і аднатонныя. Выкананыя з шарсцяных ці полівіскозных матэрыялаў. Увогуле акцэнт у гэтым сезоне робіцца на натуральныя тканіны — каб скура дыхала.

Для вячэрніх строяў застаюцца актуальнымі сукенкі з карункамі, гіпюравыя, расшытыя бліскаўкамі, упрыгожаныя пёркамі. Даўжыня — пераважна максі. А паўпразрыстая тканіна дапаможа падкрэсліць сексуальнасць жанчыны.

У паліто гэтай восенню аддаецца перавага прамым сілуэтам. У тым ліку дызайнеры выкарыстоўваюць мадэлі «оўерсайз» — нібы вы апрануліся не са свайго пляча. Гэта значыць, што паліто большае за патрэбны памер.

Выразна прагледжваецца тэндэнцыя на спушчаную лінію пляча і сілуэты «а-ля 60-я» ў мужчынскім стылі. У модзе застаюцца трэнчы, курткі і паркі з падсцёжкай і без, якія асабліва падабаюцца моладзі. Паліто могуць быць аднатонныя, у клетку ці нават у гарошак, двухбортныя ці аднабортныя, натуральныя ці штучныя футравыя паліто ўсіх колераў. З цэльнакройнымі рукавамі і скарочанымі — 7/8 ці 3/4. Часцяком выкарыстоўваецца некалькі несупастаўных матэрыялаў аднаго колеру. Гэта надае вопратцы фактурнасць.

Не выходзяць з моды А-падобныя спадніцы з падкрэсленай лініяй таліі. Не саступаюць і мадэлі, завужаныя ўнізе, сілуэта прамаго, гафрэ і плісэ. Модна асіметрыя. Яна можа праяўляцца ў дэталях (накладныя кішэні) ці ў кроі (мадэлі з запахам). Даўжыня выкарыстоўваецца самая розная — ад міні да максі. Часцей за ўсё, зразумела, жанчыны выбіраюць аптымальнае мідзі. Спадніцы максі таксама актуальныя, тым больш што яны дапамаюць жанчыне прыхаваць праблемныя зоны. А «хіт» сезона — спадніцы са скуры. Пажадана тонкай і натуральнай.

Класічныя чорныя штаны ўстойліва трымаюцца як на подыумах, так і ў нашых шафах. Для офіса зручнымі будуць яны ж, але ўжо са стрэлкамі ці кансерватыўна шырокія. «Разынкай» сезона з'яўляюцца штаны а-ля Марлен Дзітрых са складкамі каля пояса. У расфарбоўцы пераважна сустракаецца клетка, палоска ці аднатон: чорны, каньячны, гарчычны, бледна-жоўты.

У абутку перавага аддаецца абцасам тоўстым, устойлівым, скошаным, а таксама шпількам. У модзе застаюцца ўлюбёныя жанчынамі чорныя лодачкі і «лакіроўкі». А туфлі з абцасамі-цвікамі падыдуць для асабліва жанчын. Насы мусяць быць завостранымі і П-падобнымі. Для моладзі дызайнеры прапануюць красоўкі на плоскай падэшве ці на платформе (снікерсы). Або вельмі брутальныя — з байкерскай атрыбутыкай і «трактарнай» шырокай падэшвай.

У галаўных уборах перамагаюць футравыя мадэлі і вязаныя ці з палітовай тканіны берэты. Насіць апошнія можна класічна ці на бок — як модніца пажадае. У шапках гэтага сезона аднолькава выкарыстоўваецца буйная і дробная вязкі.

Застаюцца актуальнымі капелюшы, але яны крыху мяняюць сваю форму: ужо высокія з вузкімі палямі. Асаблівым попытам карыстаюцца кепі, якія падыйдуць для спартыўнага стылю ці класічнага ансамбля.

Папулярныя сярод жыхарак Беларусі легенсы ў гэтым сезоне таксама сустракаюцца. Але іх пажадана насіць толькі тады, калі гэта дазваляе фігура. У іншым выпадку легенсы можна замяніць штанамі-дудачкамі ці іншымі вузкімі мадэлямі.

Сярод колераў перавага аддаецца кобальту, сіняму, бэзавому, гарчычнаму, адценням чырвонага і каньячнага. Што тычыцца прынтоў, карыстаюцца попытам сюжэты флоры і фаўны: леапарды, тыгры, зебры, гепарды, а таксама кветкі. Не адступаюць і геаметрычныя матывы.

Жанчынам зусім не абавязкова апранацца цалкам па-мужчынску. Дастаткова выкарыстаць адну такую рэч, а астатнія — класічныя. Гэта будзе таксама модна, бо змяшэнне стыляў у гэтым сезоне лічыцца актуальным.

Для пышных дам падыдуць А-падобныя спадніцы і спадніцы-алоўкі ці сілуэт, завужаны знізу. Таксама паліто «оўерсайз» зможа апрануць кожная жанчына — ад 42-га да 56-га памеру. Мадэль можа быць 46-га памеру, а падыдзе жанчыне 50-га. Прыгожа будзе выглядаць на даме, якая не мучыць сябе дыетамі, паліто з запахам, паліто-трансформер. Яны ўніверсальныя, камфортныя і не перашкаджаюць руху. Штаны лепш выбіраць даўжыні 7/8 — па шчыкалатку.

— У наступным сезоне ды і ўвогуле па жыцці жанчынам рэкамендуецца... палюбіць сябе, — кажа Вікторыя. — Да мяне часта прыходзяць заказчыцы і кажуць: «Зрабіце мяне больш стройнай». Гэта, вядома, магчыма выканаць з дапамогай канструктыўных прыёмаў. Але... Перш за ўсё чалавек павінен палюбіць сябе такім, які ён ёсць. Прыняць сябе і сваю знешнасць. І тады не толькі адзенне, але і ўсё ў жыцці будзе мець прывабныя, на ўсе часы модныя колеры.

Вераніка ПУСТАВІТ

■

БЯЗВУСЫ «НЯНЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Заробак выхавальнікаў залежыць ад стажу працы, педагагічнай катэгорыі, нагрузкі і гэтак далей.

— Малады спецыяліст без катэгорыі зарабляе каля 3 мільёнаў рублёў у месяц. Выхавальнік з вялікім стажам можа зарабіць і пад 5 мільёнаў, бо ёсць розныя даплаты за метадычную

працу, прэміі,— працягвае загадчыца.

А ці можа так здарыцца, што гадоў праз 15–20 няма каму будзе ў садку працаваць?

Паводле слоў Маі Міхайлаўны, яшчэ ў савецкія гады гаварылі пра гэта. І тады, як і цяпер, выпадковыя людзі доўга ў садку не затрымліваліся. Гэтую працу трэба любіць!

На вуліцы...

Папрасіў накіраваць мяне на «самы цяжкі ўчастак». Загадчыца растлумачыла, што ў ясельную групу дапусціць не можа. Дзеці, калі ім 1–2 гады, вельмі насцярожана ставяцца да чужых. Напрыклад, калі мужчыны праводзілі работы па рэгуляванні катла, дык малыя нават у прыбіральню хадзіць баяліся. Даверылі групу «Чамучкі», у якой дзецям па 5–6 гадоў.

Пазнаёміўся з выхавальніцай Алай Нармантовіч. Прадставіўся. Паколькі ў журналістаў няма традыцыі называцца поўным імем, дзеці пачалі мяне звать дзядзькам Сашам. Але строгая выхавальніца *(толькі з дзецьмі перыядычна строгая, а так — вельмі абаяльны, цікавы і разумны чалавек.* — **А. П.)** сказала, што дзецям трэба называць мяне з імем па бацьку.

Дапамог малым апрануцца. Выйшлі на вуліцу гуляць. Адразу зразумеў, што цяжэй за ўсё падлічыць, колькі «маіх». (Адразу ўспомніў мультфільм пра васьміногаў. Памятаеце, як таты лічылі дзяцей?) У раздзявальні іх было 12: дзве Машы, Дзіма, Віялета, Жэня... На вуліцы на маіх вачах стала спачатку 10, а потым... 15! Вам смешна, а мне што было думаць? Выхавальніца растлумачыла: калі дзятвы больш, значыць, ёсць «госці» з іншай групы.

Фотаздымкі Віктара НІКАЛАЕВА.

Перад тым, як дзецям дазволілі корпацца ў пясочніцы, падкапаў шуфлікам пясок, каб атрымалася горка. Потым паспрабаваў зрабіць пясочную бабку — не, не тое... Дзеці падказалі, што трэба шуфлікам пабіць па пластмасавай «форме». Разы тры спрабаваў. Дзеці ж рабілі аналагічнае вельмі лёгка.

Чарга ахвотнікаў спачатку выстраілася, каб... «пакарміць» мяне «марозівам» з пяску, потым — каб я пагушкаў іх на арэлях.

Хацелі згуляць у хованкі, ды выхавальніца забараніла. Разумею: ёй жа трэба сачыць за ўсімі. А калі хто схаваецца — Бог ведае, што ён там робіць. Я пачаў адчуваць, што міжволі сам станаўлюся дзіцём, ды яшчэ і не вельмі паслухмяным.

Папрасіў Алу Валер'еўну прынесці мяч. Калі яна сышла, стаў сапраўдным выхавальнікам, адказным за ўсё, што адбываецца з дзецьмі. Апошнія пачалі нешта дзяліць, крычалі, вішчалі, штурхалі і каталіся, гарэзавалі... Было гэта ля кустоўя, і я пабаяўся, каб не параніліся. Прыйшлося трохі павысіць голас... Яны адышлі ўбок.

Пачалі мы гуляць у футбол. Праўда, футболам гэта назваць цяжка. Мяч дзеці бралі ў рукі, кідалі рукамі... Выручыў фатограф Віктар Нікалаеў, які ўмудрыўся і паздымаць, і трохі пагуляць.

Зацікавіў дзятву мой дыктафон. Я ім нешта расказваў пра газету. Слухалі з вялікім інтарэсам. А калі хадзілі строем, па чарзе спрабавалі схапіць мяне за руку. Цікавіліся, ці ёсць у мяне дзеці, колькі ім гадоў, ці маю жонку і хто яна?

«І гэтаму дала...»

Віктар вельмі ўзрадаваўся, што дзецям урэшце трэба было ісці на абед.

«Ад гэтага шуму ў мяне ўжо галава забалела»,— ціха сказаў ён. Пацікавіўся ў Алы Валер'еўны: а чаму, на яе погляд, мужчыны не працуюць выхавальнікамі?

— Ну а як вам? Нічога сабе? Муж сказаў, што і гадзіны не вытрымаў бы. Не любіць шуму, як і ўсе мужчыны. Нават калі б і плаціл ў садках больш, не думаю, што мужчын-выхавальнікаў было б шмат. Ды не кожная жанчына можа тут працаваць,— расказвае яна.

Прыйшлі ў памяшканне групы. Дзеці заўважылі, што я забыў зняць куртку і абутак. Яны пайшлі мыць рукі, але спярша пацікавіліся: ці буду я рабіць тое ж? Мяне пачалі выхоўваць!.. Даверылі разліць кісель у кубкі. Бачылі б вы, як я стараўся акуратна разліваць. Ды і загадчыца падганяла: хутка паабедаюць, а вы не ўсім налілі. «Сарока-белабока кашу варыла... Гэтаму дала, гэтаму дала...» — успомнілася мне.

Пажартаваў, што буду чытаць ім перад сном страшныя казкі. Дзятва ажывілася. Загадчыца, пакуль «мае» даядалі, запрасіла на чай.

— Вось вы іх ужо «сваімі» лічыце! Канешне, калі дзяцей любіш, да іх хутка прывязваешся. Мне падабаюцца тыя, хто ў яслі ходзяць — з імі адпачываеш. Толькі сядзеш, а яны цябе ўжо абляпілі. Але характар адразу бачу нават у самых малых: татавы і маміны і плюсы, і мінусы... Калі 4–5-гадовыя ўжо хлусіць умеюць, фантазіраваць, то гэтыя такія шчырыя, чысценькія і добрыя. Безумоўна, і большых люблю. Смешна бывае. Дзяўчынка Эвеліна займалася з дэфектолагам. Вяртаецца з заняткаў, зазірае ў мой кабінет. Пытаецца: «Загадчыца, а што ты тут робіш?» — «Працую».— «А пакажы».— «Ну, заходзь, паглядзіш». Бачыць камп'ютар. Кажу ёй, што будзем пісаць і чытаць. А яна: «Падумаеш, праца — я таксама так умею!»... Дзеці, калі праходзяць паўз мой кабінет, бывае, просяць дазволіць на крэсле пакатацца, з зайцам пагуляць,— гаворыць Мая Бобіч.

Фотаздымкі Віктара НІКАЛАЕВА.

Яна з гонарам расказвае пра падначаленых. Настасся Аляксандраўна Сапёрава — маладая выхавальніца, вельмі крэатыўная. Алена Леанідаўна Котава — з вышэйшай катэгорыяй. Людмілу Сцяпанаўну Зорыну дзятва вельмі любіць. Наталля Канстанцінаўна Смажэўская — самая вопытная памочніца выхавальніка, працуе ў яслях... Калектыў дружны. І садок на добрым рахунку ў Віцебскім раёне — штогод у прызёрах у самых розных конкурсах. Напрыклад, па арганізацыі работы з кадрамі. Ёсць добрыя шэфы: гаспадарка «Альгоўскае», ААТ «Адраджэнне».

Некаторыя былыя выхаванцы тэлефануюць нават здалёк. У прыватнасці, хлопец, які ў Вашынгтоне на алімпіядзе па інфарматыцы сярэбраны медаль атрымаў. Цяпер ён у мінскай «Сіліконавай даліне» працуе...

Як і абяцаў малым, пачытаў ім казку. Вядома, не страшную. І, не паверыце, амаль што ўсе заснулі. Зайшла ў пакой адна з работніц і вельмі здзівілася, убачыўшы мужчыну, які чытае.

З дзецьмі мы правялі час весела. Ад іх «зарадзіўся» станоўчай энергіяй, за што ім і дзякуй. А супрацоўнікам — за дазвол зрабіць цікавы рэпартаж.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Вёска Альгова, Віцебскі раён

■ Прэм'ера!

ЦЫРК ЗАПРАШАЕ НА ПАРАД

20 верасня ў Беларускім дзяржаўным цырку — прэм'ера новага сезона

«Адкрыецца ён праграмай «Парад дынастый», у якой прадстаўлены цыркавыя нумары ў лепшых традыцыях савецкага цырка: канатаходцы, жанглёры, паветраныя гімнасты, акрабаты і многія іншыя. У гэтай праграме будзе ўдзельнічаць і прадстаўнік беларускай цыркавой дынастыі Андрэй Цяплыгін. Наогул жа нашы артысты зараз знаходзяцца з гастролямі ў Сімферопалі», — паведаміў журналістам напярэдадні адкрыцця новага сезона дырэктар Белдзяржцырка Уладзімір ШАБАН.

Праграма «Парад дынастый» складаецца з двух аддзяленняў. У першым можна будзе ўбачыць эквілібрыстаў на першах — «Вандроўнікаў» (пад кіраўніцтвам Аліхана Аліханава), шоу коз Ірыны Лявіцкай, ірландскія танцы ў выкананні... коней, паветраных гімнастаў і «Сабачую акадэмію прафесара Ермакова». Другое аддзяленне парадуе гледачоў нумарам канатаходцаў «Сталкеры», а таксама сустрэчай з дрэсіраванымі малпамі, папугаямі і тэатрам марскіх жывёл, дзе будуць пінгвіны, марскія львы, маржы і іншая жыўнасць.

Ідэю праграмы трымаюць у сакрэце, аднак, як абяцае галоўны рэжысёр Белдзяржцырка Ала Мікалаева-Аліева, гледачоў чакае шмат сюрпрызаў, прыгод, трукаў і, безумоўна, доўгага настрою. Пэўная разгадка, здаецца, крыецца ў самой назве праграмы «Парад дынастый» — тут сабраны прафесіяналы з сем'яў, якіх манеж аб'яднаў не ў адным пакаленні. Усё прадстаўленне публіка правядзе ў кампаніі вядомага клоўна Мая (народнага артыста Расіі Яўгена Майхроўскага) і яго сяброў — сабачак, катоў, гусей, поні і коней. Не абыдзецца і без сустрэчы з нашчадкамі славутых цыркавых дынастый: Аліханавых, Лявіцкіх, Майхроўскіх і Ермаковых, што лічацца пачынальнікамі савецкага цыркавога мастацтва.

Дынастыя Майхроўскіх, якая сёлета адзначыць 100-гадовы юбілей, пачыналася з дуэта акрабатаў «Анбер». Сёння ж ва ўсіх праграмах цырка «Май» ёсць клаўнада і дрэсура, а кожны артыст мае сваё сцэнічнае імя. Напрыклад, жонка Яўгена Майхроўскага — клаўнэса Куку, сын Барыс выступае як Бабо, дачка Алена — Како, а ўнучка Наталля — Нюся. Майстэрства дзядулі пераймае яшчэ адзін малодшы ўнук, дарэчы, таксама Яўген.

— Я не стамляюся ад сваёй працы, таму што маю цудоўную магчымасць бываць у розных краінах, сустракаю новых людзей і раблю адкрыцці для сябе. Напрыклад, што ў Бразіліі ці Аргенціне лічаць, быццам клоўн прыносіць шчасце дзецям. Таму, калі я там на гастролях, то прыходзяць цяжарныя і мамы з дзецьмі, каб сустрэцца са мной,— дзеліцца Яўген Бернардавіч.

На арэне зараз працуе таксама чацвёртае пакаленне Лявіцкіх. Адной з маладых яго прадстаўніц з'яўляецца гімнастка Аляксандра, якая некалі выступала ў Мінску ў 6-гадовым узросце, а ў новай праграме будзе дэбютаваць з нумарам «Паветраная гімнастка ў пятлі з хула-хупамі». А родапачынальнік дынастыі Давід Лявіцкі быў адным з заснавальнікаў цыркаў у даваенны і пасляваенны час. Як архітэктар пабудаваў цыркі на Украіне, Урале і ў іншых рэгіёнах. Яго сын Рудольф — рэжысёр, інспектар манежа — стварыў нумары для сваіх траіх дзяцей. Напрыклад, дачка Ірына вось ужо 40 гадоў ладзіць спектаклі з жывёламі і радуе гледачоў.

Не пакіне без станоўчых уражанняў і «Сабачая акадэмія прафесара Ермакова» — нумар, вядомы сёння ўсяму цыркавому свету. Тут шмат цыркавых урокаў з цікавым сюжэтам і наватарскімі трукамі для сабак, якія праяўляюць сябе сапраўднымі артыстамі. Пачыналася ж гісторыя самой артыстычнай дынастыі ў 20-х гадах мінулага стагоддзя: Мікалай Ермакоў дрэсіраваў коней, працаваў з мядзведзем. А потым яго дзеці і ўнукі працягнулі сямейную справу — тут і дрэсіроўшчыкі, і эквілібрысты, і жанглёры з акрабатамі. Ермакоў-малодшы і прадставіць «Сабачую акадэмію...» мінчанам і гасцям сталіцы.

Не ўпусціце шанц гэтай восенню ўбачыць «Парад дынастый» у Белдзяржцырку. Праграма будзе паказвацца з 20 верасня па 31 кастрычніка.

Алена ДРАПКО

Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

■ Футбол. Ліга Еўропы

І Ў «ДЫНАМА» — ЧОРНЫ ДЗЕНЬ

Мінчане саступілі ў дэбютным паядынку Лігі Еўропы грэчаскаму ПАОКу з лікам 1:6

Ніхто не думаў, ніхто не прадчуваў, што сталічныя дынамаўцы паўторяць лёс барысаўскага БАТЭ ў сустрэчы з партугальскім «Порту». Але ў Салоніках, на стадыёне «Тумба», у вароты Аляксандра Гутара залятала амаль усё, што ляцела. Адзіны гол прэстыжу напрыканцы сустрэчы правёў Неманья Нікаліч.

— Мы вельмі дрэнна і няўпэўнена пачалі матч,— заўважыў **трэнер «Дынама» Уладзімір ЖУРАВЕЛЬ.**— Наогул, мы на дзіва лёгка прапусцілі галы. 6 удараў — і 5 з іх былі дакладныя.

Ліга Еўропы. Групавы этап. 1-ы тур. Група А. «Барусія» (Менхенгладбах, Германія) — «Вільярэал» (Іспанія) — 1:1, «Апалон» (Кіпр) — «Цурых» (Швейцарыя) — 3:2. **Група В.** «Бруге» (Бельгія) — «Тарына» (Італія) — 0:0, «Капенгаген» (Данія) — ХІК (Фінляндыя) — 2:0. **Група С.** «Партызан» (Сербія) — «Тотэнхем» (Англія) — 0:0, «Бешыкташ» (Турцыя) — «Астэрас» (Грэцыя) — 1:1. **Група D.** «Рэд Бул» (Аўстрыя) — «Сэлцік» (Шатландыя) — 2:2, «Дынама» (Харватыя) — «Астра» (Румынія) — 5:1. **Група Е.** ПСВ (Галандыя) — «Эштарыл» (Партугалія) — 1:0, «Панатынайкас» (Грэцыя) — «Дынама» (Расія) — 1:2. **Група F.** «Карабах» (Азербайджан) — «Сэнт-Эцьен» (Францыя) — 0:0, «Дняпро» (Украіна) — «Інтэр» (Італія) — 0:1. **Група G.** «Стандард» (Бельгія) — «Рыека» (Харватыя) — 2:0, «Севілья» (Іспанія) — «Фенорд» (Галандыя) — 2:0. **Група Н.** «Ліль» (Францыя) — «Краснадар» (Расія) — 1:1, «Эвертан» (Англія) — «Вольфсбург» (Германія) — 4:1. **Група І.** «Янг Бойз» (Швейцарыя) — «Слован» (Славакія) — 5:0, «Напалі» (Італія) — «Спарта» (Чэхія) — 3:1. **Група J.** «Сцяўа» (Румынія) — «Ольбарг» (Данія) — 6:0, «Рыя Авэ» (Партугалія) — «Дынама» (Украіна) — 0:3. **Група К.** ПАОК (Грэцыя) — «Дынама» (Беларусь) — 6:1, «Фіярэнціна» (Італія) — «Генгам» (Францыя) — 3:0. **Група L.** «Металіст» (Украіна) — «Трабзонспор» (Турцыя) — 1:2, «Легія» (Польшча) — «Локерэн» (Бельгія) — 1:0.

Тарас ШЧЫРЫ

ЗА ХАБАР — ВЫСЫЛКА

Сталічныя супрацоўнікі міліцыі затрымалі замежнага студэнта, які спрабаваў даць хабар за невыкананне пакарання.

Грамадзянін Лівана — студэнт-пяцікурснік аднаго са сталічных ВНУ — з мэтай спрыяльнага вырашэння пытання аб невыкананні дадатковага пакарання па прыгаворы суда, звязанага з пазбаўленнем права кіравання транспартным сродкам, спрабаваў даць хабар у памеры 500 долараў службовай асобе крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Па факце заведзена крымінальная справа. У выпадку, калі віна замежнага студэнта будзе прызнана, пасля, натуральна, адбыцця пакарання фігурант будзе высланы за межы Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Крымінал

КАРЫСТАЎСЯ ДЗЯРЖАЎНЫМ ЯК СВАІМ

У дачыненні да колішняга намесніка кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска пракуратура Савецкага раёна сталіцы завяла крымінальную справу. Колішняга чыноўніка падазраюць у злоўжываннях.

Як паведамляе ўпраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама, было ўстаноўлена, што ў перыяд з лютага мінулага года па красавік бягучага той, быўшы службовай асобай і займаючы адказнае становішча, выкарыстоўваў службовы аўтамабіль і кіроўцу ўнітарнага прадпрыемства «Рэмаўтадар Цэнтральнага раёна г. Мінска» ў асабістых мэтах. Трэба сказаць, што чыноўнік з'яўляўся куратарам гэтага дзяржаўнага прадпрыемства. Сваімі дзеяннямі колішні намеснік кіраўніка адміністрацыі раёна нанёс яму шкоду на суму больш як 33 мільёны рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

на IV квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 9 КАСТРЫЧНІКА 2014 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 14.10 2014 года будзе разыграна 7 цеплавентылятараў і суперпрыз — хлебапеч. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» чытайце ў нумары газеты «Звязда» за 4.09.2014.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 6.09.14 ПА 31.12.14.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2422 ад 01.09.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на IV кв. або 2-е паўг. 2014 года

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Суседзі

Веласіпед, байдарка і QR-код

Партнёры з Гродна і Друскінінкая выпрацоўваюць і ажыццяўляюць новыя варыянты памежных кантактаў

Аб гэтым ішла гаворка за «круглым сталом» у Гродне ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь» на 2007–2013 гады «Прасоўванне турызму праз павышэнне інфармаванасці аб гісторыі і культуры рэгіёнаў». Партнёры праекта з літоўскага боку — Балтыйскі інстытут аграбізнесу, адміністрацыя муніцыпалітэта г. Друскінінкай і Літоўская асацыяцыя сельскага турызму, з беларускага — аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама і абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз».

На турыстычным веламаршруце ў лесапаркавай зоне «Пышкі».

Дзякуючы гэтаму праекту нашы літоўскія суседзі (уладальнікі турфірмаў, аграсядзіб, экскурсаводы) сёлета пабывалі ў вандроўцы па маршруце «Гродна — Шчучын — Жалудок — Нясвіж — Мір — Навагрудак — Валеўка — Ліда — Гродна», на рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, прайшлі на байдарках па водным маршруце «Аўгустоўскае кола», які злучае маляўнічыя мясціны Гродна і Друскінінкая. Усё гэта дзеля не толькі асабістых эмоцый, але і турыстычнага бізнесу. Па словах аднаго з удзельнікаў сплаву, **эксперта праекта Джугаса ВАЙЧУНАСА,** сваімі ўражаннямі ён падзяліўся з сябрамі ў Вільнюсе, і яны так зацікавіліся, што бліжэйшым часам збіраюцца самі апрабаваць гэты водны шлях.

Шэраг варыянтаў памежнага супрацоўніцтва быў абмеркаваны і падчас апошняй сустрэчы ў Гродне. Госці з Літвы азнаёміліся з умовамі бізнесу ў свабоднай эканамічнай зоне «Гроднаінвест», у тым ліку на тэрыторыі спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал», удзельнічалі ў рабоце міжнароднага інвестыцыйнага форуму «Гродзеншчына на скрыжаванні межаў», пабывалі на кірмашы турыстычных паслуг у рамках рэспубліканскай выставы «Еўрарэгіён «Нёман-2014». Акрамя таго, разам з беларускімі партнёрамі па праекце літоўцы здзейснілі велаэкскурсію па ўрочышчы «Пышкі», дзе завяршаецца стварэнне турыстычнага маршруту працягласцю 30,5 км з абсталяваннем 12 месцаў для адпачынку падарожнікаў. Гэта першы буйны праект веласіпеднага турызму на Гродзеншчыне, які, дарэчы, фінансуецца таксама па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь».

Мэта праекта — павелічэнне колькасці турыстаў і адпачывальнікаў на памежных тэрыторыях Беларусі і Літвы шляхам стварэння магчымасцяў для паўнавартаснага знаёмства з гісторыка-культурнай спадчынай Друскінінкая, Гродна і навакольля гэтых гарадоў, больш глыбокага і эфектыўнага выкарыстання гэтага патэнцыялу, а таксама стымуляванне партнёрства, узаемадзеяння і абмену вопытам паміж прадстаўнікамі ўлады і бізнесу. Мяркуецца, што ўкараненне інавацый у маркетынгу і прасоўванні трансгранічнага турызму павінна не толькі спрыяць чалавечым кантактам паміж жыхарамі памежжа, але і прынесці суседнім рэгіёнам дадатковыя эканамічныя выгады. Акрамя таго, прыклады паспяховай работы ў галіне турызму папулярызуюцца на трэнінгах для ўдзельнікаў праекта.

Идэя цікавага веласіпеднага маршруту — паміж Гродна і Друскінінкаем — цяпер рэалізуецца і ў рамках праекта «Прасоўванне турызму праз павышэнне інфармаванасці аб гісторыі і культуры рэгіёнаў». Ён распачынаецца ў вышэйзгаданым урочышчы «Пышкі» і праходзіць праз фантастычную па прыгажосці даліну Райгардас, якая натхняла творчасць славутага літоўскага мастака і кампазітара Чурлёніса. **Нацыянальны кіраўнік праекта з беларускага боку Сяргей КАЛЯДА** паведаміў, што ідэя падтрымана адміністрацыяй Друскінінкая, а неўзабаве плануецца падарожжа на веласіпедах па гэтым маршруце з удзелам кіраўнікоў уладных структур Гродзеншчыны.

У межах праекта з'явіліся прапановы і па іншых турыстычных маршрутах. Гэта водны шлях на байдарках з Гродна ў Друскінінкай (з прыпынкамі для адпачынку, знаёмства з прыродным хараством, помнікамі гісторыі і культуры), аўтамабільны маршрут «7 сталіц Вялікага Княства Літоўскага» (Вільнюс, Тракай, Кернава, Навагрудак, Гродна, Гальшаны, Варута), пешаходныя вандроўкі.

За круглым сталом былі таксама прэзентаваны турыстычныя аб'екты, уключаныя ў базу звестак QR-кодаў — з інфармацыяй на шасці мовах, у тэкставым, гукавым і відэафармаце. Праз сродкі мабільнай сувязі будзе забяспечвацца доступ да звестак пра 50 гісторыка-культурных аб'ектаў у Друскінінкаі і 50 — у Гродне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Этот проект финансируется Европейским Союзом
This project is funded by the European Union

УНП 590373966

ХТО МЫ Ў ГЛАБАЛЬНЫМ СВЕЦЕ?

Вядома, што гэтае пытанне з рознай ступенню актыўнасці задавалі і задаюць сабе ўсе тыя, хто намагаецца зразумець, асэнсаваць, усвядоміць — хто ж мы, беларусы, у чалавечым космасе, які наш лёс быў і будзе сярод шматаблічнай людской разнастайнасці? Пытанне няпростае і неадназначнае, як складаны і няпросты адказ на яго. Але ж хіба знойдзеш адказ, калі не імкнешся да гэтага? Бо зразумела, што на другі бок дарогі не пяройдзеш, калі не будзеш рухацца. Так і ў нашай сітуацыі. Разуменне нас саміх у глабальным свеце патрабуе і ад кожнага з нас напружанай працы па збіранні і асэнсаванні ўсіх абставін і фактаў нашага мінулага і сённяшняга жыцця як сукупнасці фактараў, якія ўплывалі і на наша месца і ролю ў гісторыі, на пошук сваёй дарогі да нацыянальнага храма.

На гэтыя развагі падштурхнула мяне кніга І.І. Антановіча «Беларусь у глабальным свеце», якая нядаўна выйшла ў мінскім выдавецтве «Кніжны Дом». Кніга мае і дадатак да сваёй назвы: дыялектыка станаўлення і інтэграцыі. А гэта, безумоўна, дае падставы спадзявацца, што аўтар павядзе чытача не толькі гістарычнымі дарогамі і сцежкамі станаўлення беларускага этнасу, але будзе асэнсоўваць гэты шлях па-філасофску. Так яно на самай справе і адбываецца, мо яшчэ і таму, што аўтар — доктар філасофскіх навук, прафесар. А яшчэ ён — заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Даследаванне прысвечана высвятленню абставін і ўмоў станаўлення не толькі беларускага этнасу, але і нацыянальнай самасвядомасці на працягу нашай тысячагадовай гісторыі; як зазначаецца ў анатацыі, «ад удзельных княстваў у складзе Кіеўскай Русі, у Вялікім Княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і, нарэшце, Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». Шлях, бясспрэчна, доўгі і зусім не бязвоблачны, як не беспраблемнае і даследаванне аўтара.

І.І. Антановіч уводзіць у навуковы зварот шматлікія крыніцы, асобныя з якіх альбо былі дагэтуль невядомымі, альбо недастаткова ўважліва даследаваліся. І гэта робіць яго працу яшчэ больш каштоўнай і карыснай, выказанае ім набывае больш шырокі кантэкст. Дасведчанасць не толькі ў нашай гісторыі, а валоданне інфармацыяй і ведамі аб даследаваннях і поглядах замежных аўтараў надаюць большай грунтоўнасці новаму даследаванню І.І. Антановіча. Асабліва месца ў кнізе займае аналіз дыялектыкі станаўлення беларусаў ва ўмовах трыадзінства ўсходнеславянскага племені — беларусы, украінцы, рускія. Аўтарскае даследаванне дасягае прамежкавай часавай мяжы — абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі ў 1991 годзе. Значыць, можна спадзявацца, што будзе працяг, бо нашы стасункі з глабальным светам не заканчваюцца гэтым перыядам. Новы час таксама вымагае ад Беларусі і беларусаў новых дзеянняў, новых намаганняў па асэнсаванні сваёй ролі ў сённяшнім небеспраблемным чалавечым хаўрусе.

Каб зразумець абсягі аўтарскага пошуку беларускага шляху, дастаткова назваць хоць бы некаторыя яго напрамкі. А гэта — пачатак дзяржаўнасці і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, беларускі пачатак у Кіеўскай Русі, Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, развіццё нацыянальнай самасвядомасці ва ўмовах заходнерусізму і, вядома ж, рэвалюцыйныя і паслярэвалюцыйныя гады развіцця не толькі савецкіх рэспублік, а і ўсяго іншага свету, які гэтымі рэвалюцыямі быў зменены.

У І.І Антановіча заўсёды быў свой погляд, свой падыход, сваё бачанне беларускіх рэалій у іх гістарычным развіцці і ў суадносінах з гісторыяй іншых народаў. Не мяняецца такі падыход і ў новай кнізе. Магчыма, тут яшчэ больш, чым у іншых выданнях, палемічнасці і знарочыстай завостранасці некаторых пытанняў, асабліва тых, якія выклікалі раней і выклікаюць сёння неадназначныя ацэнкі і спрэчкі (адно хацелася б пажадаць, каб больш пільнымі былі вочы і аўтара, і выдаўцоў адносна памылак і недакладнасцяў, якія, на жаль, закраліся ў кнігу). А гэта азначае, што часта аўтар ідзе па цаліку, дзе яго падпільноўваюць розныя нечаканасці і складанасці. Але ён, маючы дастатковы вопыт даследаванняў, бо выдаў ужо не адну кнігу, звязаную з гісторыяй беларускага этнасу, умее іх пераадольваць (на яго творчым рахунку 20 манаграфій і больш за 300 навуковых публікацый як у айчыннай, так і замежнай перыёдыцы). А такі падыход, дзе бачыцца няпростая і небясхмарная дарога да ісціны, якраз і прывабліве чытача, робіць яго далучаным да пошуку гэтай самай ісціны, часам нават у спрэчках з пазіцыяй аўтара. Але ў тым і каштоўнасць любога даследавання, што яно — не безэмацыйны і гладкі тэкст, а зацікаўленыя развагі, няхай сабе нават супярэчлівыя, бо гэта падштурхоўвае і чытача да роздуму, да разваг, да пошуку ісціны — ці то разам з аўтарам, ці то сваім асабістым, не заўсёды згодным з аўтарскім, шляхам. Асабліва калі даследуюцца новыя факты і аспекты альбо даецца новы погляд на, здавалася б, вядомае і звыклае.

Так і ў новым даследаванні прафесара І.І. Антановіча. Яго асэнсаванне Беларусі ў глабальным свеце заклікае чытача ў суразмоўцы. І такое сумоўе, такі дыялог прыводзіць кожнага да больш глыбокага разумення, што і як адбывалася на нашым гістарычным шляху і што трэба рабіць сёння, каб наш далейшы рух не быў бязмэтным і хаатычным.

І яшчэ адна асаблівасць новай кнігі І.І. Антановіча — пераканаласць у сваіх высновах і развагах. Нават тады, калі некаторыя моманты нашага быцця рознымі аўтарамі разглядваюцца па-рознаму, даследчык імкнецца доказна і пераканаўча абгрунтаваць сваю пазіцыю. Уяўляю, што такі падыход не заўсёды знойдзе адэкватны водгук у чытача. Але і гэта патрэбна сённяшняму ўдумліваму шукальніку ісціны, бо яна, як вядома, нараджаецца ў спрэчках. Асабліва ў наш глабальны і глабалізаваны час, калі і беларусам, і Беларусі не заўсёды ў ім утульна і камфортна. Але ж беларусы здаўна загартаваны ў розных суровых выпрабаваннях, годна прайшлі праз усе нягоды і беды і засталіся на сваёй зямлі беларусамі. Дык чаму ж нам не распарадзіцца па-гаспадарску тым, што маем, чым надзяліла нас гісторыя, што з'яўляецца нашым набыткам, які неабходна не толькі шанаваць, але і ўдумліва аналізаваць, асэнсоўваць, перадаваць нашым наступнікам. На гэтым шляху асэнсавання кніга І.І. Антановіча «Беларусь у глабальным свеце», бясспрэчна, будзе тым патрэбным каталізатарам, які не дасць нашай думцы заспакоіцца, суцішыцца і заснуць.

Анатоль БУТЭВІЧ

■

ЖЫЦЬ ЭКАЛАГІЧНА

Цэнтр экалагічных рашэнняў запускае дыстанцыйныя экалагічныя курсы. У анлайн- школе аматарам экалогіі спецыялісты распавядуць пра «зялёнае» спажыванне, абыходжанне з адходамі, хатняе энергазберажэнне, экалагічны транспарт. Такім чынам кожны «студэнт» атрымае багаж ведаў, неабходны для арганізацыі экалагічнага ладу жыцця.

Семестр разлічаны на сем тыдняў. Асаблівых патрабаванняў да студэнтаў няма, хіба што жаданне, доступ да інтэрнэту і 2-3 гадзіны вольнага часу на тыдзень. Дарэчы, у навучэнцаў ёсць магчымасць самастойна планаваць навучальны працэс. Першы курс называецца «экалагічна дружалюбны лад жыцця для маладой мамы», але, як запэўніваюць арганізатары, ён будзе цікавы і іншым. Запісацца на экакурсы можна на сайце study.ecoidea.by, удзел у іх бясплатны.

Кацярына РАДЗЮК.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	**Право заключения договора аренды объекта общественного питания, площадью 888,2, расположенного на вокзале железнодорожной станции Гродно по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37, сроком 10 лет.**
Начальная цена продажи	22 649 100 (двадцать два миллиона шестьсот сорок девять тысяч сто) белорусских рублей с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	- коэффициент 1,5;
Сумма задатка	2 264 910 (два миллиона двести шестьдесят четыре тысячи девятьсот десять) белорусских рублей
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел.: 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	- организация общественного питания на железнодорожном вокзале станции Гродно. - обеспечение горячим питанием (обедами) работников Гродненского железнодорожного узла с 10% торговой наценкой и отнесением разницы в наценке за счет собственных средств предприятия
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 22 октября 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3.	
